**МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**
**БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ**
**ФИЛОЛОГИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ**

УТВЕРЖДАЮ
Ректор
________________А.Д. Король
"____"____________ 2018 г.

Регистрационный № ______

# Программа вступительного испытания

## для специальности второй ступени высшего образования (магистратуры):

## 1-21 80 10 Литературоведение

2018

**СОСТАВИТЕЛИ:**

Т.П.Казакова, заведующая кафедрой истории белорусской литературы, кандидат филологических наук, доцент;

С.Я.Гончарова-Грабовская, заведующая кафедрой русской литературы, доктор филологических наук, профессор;

Т.И.Шамякина, заведующая кафедрой теории литературы, доктор филологических наук, профессор.

***РЕКОМЕНДОВАНА К УТВЕРЖДЕНИЮ:***

Советом филологического факультета (протокол № 5 от 21 декабря 2017г.)

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

# XI — ПАЧАТКУ XXI СТСТ.

**Літаратура ранняга Сярэднявечча XI—XIII стст.** Агульны перыяд развіцця трох усходнеславянскіх літаратур — беларускай, рускай і ўкраінскай. Першыя помнікі пісьменства на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Цэнтры кніжнай культуры (Кіеў, Ноўгарад, Полацк, Смаленск, Тураў і інш.). Культурныя сувязі ўсходніх славян з Візантыяй, Балгарыяй. Утварэнне Вялікага княства Літоўскага. Асноўныя жанры і стылявое поле літаратуры. Перакладная літаратура. Арыгінальная літаратура. "Слова пра Закон і Ласку" Іларыёна, мітрапаліта Кіеўскага. Праблематыка, ідэя і кампазіцыя твора, Свяшчэннае Пісанне і канцэпцыя сусветнай гісторыі. Пропаведзі, прытчы, малітвы, каноны Кірыла, епіскапа Тураўскага. Агіяграфія ўсходніх славян. "Сказанне пра Барыса і Глеба", "Жыціе Еўфрасінні Полацкай", "Жыціе Кірыла Тураўскага", "Жыціе Аўраамія Смаленскага", "Аповесць пра Меркурыя Смаленскага". Летапісанне ўсходніх славян. "Аповесць мінулых гадоў". "Кіеўскі летапіс". "Галіцка-Валынскі летапіс". "Слова пра паход Ігара" як феномен усходнеславянскай культуры.

**Літаратура позняга Сярэднявечча XIV—XV стст.** Палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіцце беларускіх княстваў. Фарміраванне беларускай народнасці і старабеларускай мовы. Перакладная літаратура. "Аповесць пра трох каралеў". "Аповесць пра Трою". "Пакуты Хрыста". "Жыціе трох віленскіх пакутнікаў". Арыгінальная літаратура. Росквіт Вялікага княства Літоўскага і развіцце літаратуры. Станаўленне агульнадзяржаўнага беларуска-літоўскага летапісання. "Летапісец Вялікіх Князёў Літоўскіх", "Беларуска-літоўскі летапіс 1430—1446 гг.". "Хаджэнне ў Царград…" Ігнація Смаляніна (пач. XV ст.). Урачыстае красамоўства. Грыгорый Цамблак. Уплыў вучэння ісіхазму на фармаванне светапогляду мітрапаліта Вялікага княства Літоўскага. "Слова пахвальнае Яўфімію Тырнаўскаму". "Слова на Узвіжанне святога Крыжа". "Слова на адсячэнне галавы Іаану Хрысціцелю".

**Літаратура ранняга Рэнесансу (першая палова XVI ст.).** Эпоха Рэнесансу (Адраджэння) у беларускай культуры. Праявы гуманізму у грамадска-палітычным жыцці Вялікага княства Літоўскага XVI ст. Навучанне беларусаў у замежных універсітэтах. Узнікненне і развіццё кнігадрукавання. Асноўныя цэнтры беларускага кнігадрукавання: Прага, Вільня, Берасце, Нясвіж, Лоск. Мецэнат у мяшчанскім (Багдан Онькаў, Якуб Бабіч) і ў магнацкім (Радзівілы, Астрожскія, Хадкевічы, Кішкі і інш.) асяроддзі. Полілінгвізм тагачаснага пісьменства Беларусі. Асноўныя літаратурныя мовы: беларуская, лацінская, польская, стараславянская.

Францыск Скарына. Адносіны першадрукара да тэкстаў Святога Пісання — эзатэрычныя і экзатэрычныя кнігі Бібліі ў разуменні Ф. Скарыны. Хрысціянскае асветніцтва Ф. Скарыны. Элементы тэалогіі, філасофіі, правазнаўства, філалогіі, эстэтыкі і этыкі ў прадмовах першадрукара. Ян Вісліцкі. "Пруская вайна" — паэтычны помнік мінуламу Айчыны. Роля антычнай сістэмы вобразаў і вобразаў-сімвалаў у сюжэтнай пабудове помніка. Дзяржаўны патрыятызм Яна Вісліцкага, пераклады паэмы "Пруская вайна" з лацінскай мовы на мовы беларускую, польскую і рускую. Мікалай Гусоўскі. Рымскі і Кракаўскі перыяды творчасці. "Песня пра зубра" (1523). Адлюстраванне гуманістычных поглядаў М. Гусоўскага ў прысвячэнні каралеве Боне. Гістарычныя аналогіі і паралелі. Вайна і мір у паэме М. Гусоўскага, гуманістычны пафас твора. Летапісанне. "Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага". Новая патрыятычная і дзяржаўная канцэпцыя. "Хроніка Быхаўца". Ідэі літоўска-русінскай еднасці ў дзяржаве. Легендарнае і гістарычнае ў помніку. Адлюстраванне еўрапейскіх падзей у творы. Беларуская рэфармацыйная публіцыстыка. Творчасць Сымона Буднага і Васіля Цяпінскага. Роля беларускай, лацінскай і польскай моў у засваенні ідэй Рэфармацыі. Спецыфіка рэфармацыйнага руху на Беларусі. Традыцыі Ф. Скарыны ў творчасці Сымона Буднага і Васіля Цяпінскага.

**Літаратура позняга Рэнесансу (другая палова XVI ст.).** Паэзія позняга Рэнесансу. Генеатліконы, эпіталамы, фунеральныя вершы Г. Белазора, С. Кулакоўскага, Я. Пратасовіча, Я. Радвана і інш. Прыклады філасофскай паэзіі ("Чалавечы век" С. Кулакоўскага), рэлігійна-палемічнай (ананімная паэма "Апалагетык, гэта ёсць Абарона канфедэрацыі"), грамадзянскай лірыкі ("Італійскі арэшнік" Я. Казаковіча). Адлюстраванне падзей Лівонскай (Інфлянцкай) вайны (1558—1582) у героіка-эпічных паэмах "Апісанне маскоўскага паходу князя Крыштафа Радзівіла" Ф. Градоўскага і "Радзівіліяда" Я. Радвана. Арыентацыя на антычныя ўзоры, міметычная практыка паэтаў другой паловы XVI ст. Рыторыка як аснова паэтыкі. "Лямант няшчаснага Рыгора Осціка" — ліра-эпічная паэма, выдадзеная пад псеўданімам Станіслава Лаўрэнція. Цыпрыян Базылік. "Пратэй, або Пярэварацень". Заклік да грамадскай згоды і рэлігійнай талеранцыі. Андрэй Рымша. Вершы на старабеларускай мове: "Храналогія... " (1581), эпіграмы на гербы А. Валовіча, Л. Сапегі, Т. Скуміна. "Дзесяцігадовая аповесць ваенных спраў князя Крыштафа Радзівіла". Жанравы сінкрэтызм твора. Гальяш Пельгрымоўскі. "Гутарка аднаго паляка з маскалём..." (1601). Г. Пельгрымоўскі як найбольш верагодны аўтар твора. Адлюстраванне ў вобразах галоўных герояў ліцвінскай і маскоўскай ментальнасці. "Пасольства Льва Сапегі да вялікага князя маскоўскага" (1603). Дакументальная аснова паэмы. Шырокі спектр палітычных, рэлігійных і культурных праблем, закранутых у творы. Ян Пратасовіч. "Inventores rerum, альбо Кароткае апісанне, хто што вынайшаў і ва ўжытак людзям даў" — першая ў Рэчы Паспалітай вершаваная энцыклапедыя. Змест і структура кнігі. Выкарыстанне

аднайменнага сачынення Палідора Вергілія і аўтарскія рэфлексіі Я. Пратасовіча. Мемуарная літаратура. Праяўленне цікавасці да лёсу асобнага чалавека як характэрная рыса эпохі Рэнесансу. Першыя творы мемуарнага жанру ў шматмоўнай беларускай літаратуры: “Дзённік падарожжа ў Італію” Ю. Радзівіла, вершаваная аўтабіяграфія М. Стрыйкоўскага “Пра сябе і прыгоды свае ў размаітых краінах”, “Хроніка сям’і Уніхоўскіх”. Г. Пельгрымоўскі — пачынальнік “маскоўскай тэмы” ў гісторыка-мемуарнай літаратуры: празаічны “Дыярыуш пасольства да вялікага князя маскоўскага ў 1600—1601 гг.”. Мікалай Крыштаф Радзівіл. “Перыгрынацыя, або Паломніцтва ў Святую Зямлю”. Фёдар Еўлашоўскі. “Успаміны...”. Перакладная проза. Шляхі пранікнення перакладной літаратуры на тэрыторыю Беларусі. Пераклад, рэдакцыя, творчая перапрацоўка іншамоўнага тэксту. “Траянская гісторыя”, “Аповесць пра Баву”, “Аповесць пра Трышчана”.

**Літаратура эпохі Барока (канец XVI—XVII стагоддзі).** Эпоха Барока ў беларускай культуры і стыль барока ў літаратуры. Выкарыстанне алегорыкі, эмблематыкі, сімволікі ў барочных творах, іх пэўны схематызм і топіка. Жанравая разнастайнасць стылю, сувязь літаратуры барока з іншымі відамі мастацтва. Адметнасць беларуска-ўкраінскага літаратурнага барока, яго полілінгвізм. Уплыў ідэалогіі Контррэфармацыі на дзяржаўную патрыятычную канцэпцыю Рэчы Паспалітай. Прыняцце рашэнняў Трыдэнцкага сабору 1545—1563 гг., іх роля ў распрацоўцы ідэй уніі польскімі, беларускімі і украінскімі дзеячамі. Палемічная публіцыстыка як асаблівы від літаратурнай творчасці канца XVI — першай паловы XVII ст. Праблема веры, дзяржавы, культуры, мовы ў творах Бенядыкта Гярбеста “Указанне шляху”, Пятра Скаргі “Пра адзінства касцёла Божага пад адзіным пастырам”, “Берасцейскі сабор і абарона яго”. Развіццё ідэй уніі ў творчасці Іпація Пацея: “Унія”, “Гармонія”, “Ерасі”.

**Школьны тэатр і драматургія.** Пашырэнне геаграфіі школьных прадстаўленняў: дзейнасць езуіцкіх тэатраў у Полацку, Нясвіжы, Гродна і інш. Дамінацыя паэтыкі барока ў школьных драмах: “Камедыя пра патрыярхаў Якуба ды Іосіфа” (Гродна, 1651) Яўстафія Пылінскага, “Духоўнае прычасце святых Барыса і Глеба” (Полацк-Орша, каля 1693 г.). Нацыянальны і сацыяльны каларыт вобразаў у інтэрмедыях з аршанскага кодэкса. Маральна-дыдактычная накіраванасць і камізм беларускіх інтэрмедый у агіяграфічнай польскамоўнай драме.

**Літаратура пераходнага перыяду (канец XVII — першая палова XVIIIстст.)** Ідэалогія Контрэфармацыі і эстэтыка барока. Беларускае мясцовае летапісанне ў XУIII ст. Гістарычныя і літаратурныя вартасці “Магілёўскай хронікі” і “Віцебскага летапісу”. Мемуарыстыка Беларусі ў XУIII ст.: “Дыярыюш” М. Радзівіла і “Успаміны” М. Матушэвіча. Белетрызацыя мемуарнага жанру ў “Авантурах майго жыцця”

С. Пільштыновай. Парадыйна-сатырычная і гумарыстычная проза. Асаблівасці барочнай паэтыкі зборніка К. Жэры “Торба смеху”. Беларускамоўная паэзія першай паловы ХУІІІ ст. Песенна-інтымная лірыка. Адметнасць “звярыных гратэскаў” Д. Рудніцкага. Народны тэатр — “батлейка” на Беларусі; спецыфіка школьных драм і інтэрмедый; прыдворны тэатр. Паэзія і драматургія Францішкі Уршулі Радзівіл.

**Літаратура эпохі Асветніцтва (другая палова XVIII — 10-я гг. XIX ст.).** Асаблівасці беларускага Асветніцтва, мастацкія напрамкі класіцызму і сентыменталізму. Творчая спадчына І. Храптовіча, М. Карыцкага, А. Нарушэвіча, Ю.Нямцевіча, Ф. Князьніна, Ф. Рысінскага, Я. Аношкі і феномен шматмоўнасці тагачаснай паэзіі. Беларускамоўная патрыятычная і бурлескна-парадыйная паэзія.Забельскі школьны тэатр. Драматургічнае майстэрства К. Марашэўскага і М. Цяцерскага. Сентыменталізм і асветніцкія ідэалы ў драматургіі Ф. Карпінскага і Ф. Багамольца. Ідэйна-мастацкія асаблівасці оперы “Агатка” Мацея Радзівіла і Яна Давіда Голанда, яе роля і значэнне ў тагачаснай культуры Беларусі.

**Літаратура эпохі рамантызму (20—40-я гг. XIX ст.).** Станаўленне рамантызму ў Беларусі і фальклорныя традыцыі. Жыццё і творчасць А. Міцкевіча. Асаблівасці стылю міцкевічаўскіх балад, рамансаў, санетаў і паэм. А.Міцкевіч і беларуская культура. Творчая спадчына Я. Чачота. Жыццёвыя і творчыя шляхі філаматаў і філарэтаў (Т. Зана, А. Адынца, А. Петрашкевіча, А. Ходзькі, І. Дамейкі). Рэальнае і легендарнае ў біяграфіі П. Багрыма. Жанрава-стылістычныя асаблівасці ананімнай літаратуры. Паэма “Энеіда навыварат” у беларускім літаратуразнаўстве. Тэматыка і праблематыка польскамоўнай паэзіі Беларусі 40-х гг. XIX ст. Творчая спадчына братоў Грымалоўскіх, А. Грозы, Т. Лады-Заблоцкага і інш. Жанр шляхецкай “гавэнды” ў прозе Г. Равускага і І. Ходзькі. Р. Падбярэзскі і Ф. Савіч у гісторыі беларускай літаратуры. Літаратурная спадчына Я. Баршчэўскага. Жанрава-стылёвыя асаблівасці і паэтыка твора “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”.

**Літаратура эпохі рамантызму (50—70-я гг. XIX ст.).** Палеміка пра народнасць літаратуры і сутнасць прынцыпу мастацкага этнаграфізму. Шматграннасць творчай асобы В. Дуніна-Марцінкевіча. Значэнне творчасці пісьменніка ў гісторыі беларускай літаратуры. Загадка аўтара, ідэйна-вобразны змест паэмы Адэлі з Устроні “Мачаха”. Сакралізацыя радзімы ў творчасці У. Сыракомлі. Творчая спадчына В. Каратынскага. Арганізацыя літаратурнага руху і асветніцкая дзейнасць А. Кіркора. Літаратурна-грамадскі рух на Віцебшчыне. Жыццё і творчасць А. Вярыгі-Дарэўскага, А. Рыпінскага, Г.Марцінкевіча, Я. Вуля. Біяграфія, публіцыстычнае майстэрства і паэтычны талент К. Каліноўскага. Палемічная скіраванасць і жанрава-стылёвыя асаблівасці ананімных і аўтарскіх вершаваных “гутарак”; зборнік “Рассказы на белорусском наречии”. Праблема аўтарства, паэтыка і стыль паэмы “Тарас на Парнасе”.

**Літаратура эпохі пазітывізму (80—90-я гг. XIX ст.).** Стылявы сінкрэтызм, паглыбленне крытычнага пафасу, узмацненне рэалістычных

тэндэнцый і сатырычнай скіраванасці, завастрэнне сацыяльна-этычных канфліктаў у тагачаснай літаратуры. Асветніцкая дзейнасць А. Ельскага. Творчая спадчына Ф. Савіча-Заблоцкага. Публіцыстыка беларускіх народнікаў. Мастацкае асэнсаванне "краёвай" рэчаіснасці ў "сялянскіх" аповесцях Э. Ажэшкі. Патрыятычныя матывы, адлюстраванне беларускіх рэалій і ментальнасці ў паэзіі З. Манькоўскай. Мастацкая спецыфіка творчай спадчыны Ф. Багушэвіча. Асаблівасці адлюстравання рэчаіснасці і выяўленне сацыяльнай псіхалогіі сялянства Жыццёвы шлях і асноўныя матывы паэзіі Я. Лучыны. Ф. Тапчэўскі, А. Абуховіч, А. Гурыновіч у гісторыі беларускай літаратуры.

**ХХ стагоддзе як гістарычная і культурная эпоха**. Галоўныя гістарычныя падзеі. Асноўныя сацыяльна-палітычныя і эканамічныя працэсы. Савецкая гісторыя: знакавыя падзеі, вынікі і ўрокі. Гуманістычныя традыцыі савецкай культуры. "Вялікі стыль" у мастацтве СССР. Пошук новай культурнай парадыгмы ў канцы ХХ — пачатку ХХІ ст. Чалавек і розныя формы соцыуму — цэнтральная праблема мастацкай культуры ХХ ст. Паглыбленне семантыкі мастацкага твора ў ХХст. Суадносіны традыцый і наватарства ў розных напрамках літаратуры ХХ ст. (рэалізм, мадэрнізм, постмадэрнізм). Уплыў іншых відаў мастацтва і СМІ на літаратуру ХХ — пачатку ХХІ ст. Паскарэнне развіцця мастацкага працэсу — і сусветнага, і ўласнабеларускага.

**Беларуская літаратура перыяду нацыянальнага Адраджэння (1900—1930 гг.).** Перыядызацыя беларускай літаратуры ХХ ст. Яе нацыянальна-гістарычныя і мастацка-эстэтычныя асновы. Літаратурнае ХХ стагоддзе як цэласная гісторыка-культурная з'ява. Беларуская літаратура і нацыянальна-вызваленчы рух. Нацыянальныя традыцыі і мастацкае наватарства. Агульначалавечае і нацыянальна-самабытнае ў змесце, характары і напрамку ідэйна-эстэтычнага станаўлення беларускай літаратуры. Багацце творчых індывідуальнасцей, шматстайнасць ідэйнага і эстэтычнага пошуку. Асноўныя філасофска-мастацкія ідэі, архетыпы і вобразы, міфалагемы і лейтматывы беларускай літаратуры ХХ ст. Жанрава-стылёвы абсяг мастацкай літаратуры, міжродавыя формы і дыфузія жанраў.

**Літаратура пачатку ХХ стагоддзя**. Грамадскі і культурны рух. Беларускамоўныя выданні. Роля "Нашай нівы" ў абуджэнні нацыянальнай самасвядомасці народа, у стварэнні кола нацыянальнай інтэлігенцыі. Мастацкія плыні гэтага часу: рамантызм, рэалізм, сімвалізм, імпрэсіянізм і інш. Сузор'е талентаў: Ядвігін Ш., Карусь Каганец, Канстанцыя Буйло, Янка Журба, і інш.

**Літаратура 20-х гадоў.** Беларуская адраджэнская ідэя і "нашаніўская" літаратурная традыцыя. Складанасць і супярэчлівасць гісторыка-палітычнай сітуацыі і цяжкасці станаўлення нацыянальнай культуры і літаратуры. Патрыятычная публіцыстыка Я. Купалы, Ц. Гартнага, З. Бядулі, М. Гарэцкага, А. Гаруна, А. Луцкевіча і інш. Тагачасная

перыёдыка. Збіранне асноўных літаратурна-творчых сіл у Мінску. Дзейнасць літаратурных аб'яднанняў.

**Паэзія 20-х гадоў**. Публіцыстычны пафас лірыкі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Вацлава Ластоўскага, Цішкі Гартнага, Міхася Чарота, Уладзіміра Дубоўкі, Язэпа Пушчы, Уладзіміра Жылкі, Паўлюка Труса, Уладзіміра Хадыкі, Тодара Кляшторнага, Алеся Дудара, Анатоля Вольнага і інш. Прыход у літаратуру маладой генерацыі: Пятра Глебкі, Максіма Лужаніна, Аркадзя Куляшова, Петруся Броўкі, Змітрака Астапенкі, Алеся Звонака і інш. Паэтычнае асэнсаванне рэвалюцыйнай эпохі. Ідэйна-мастацкая і жанрава-стылёвая разнастайнасць лірыкі 20-х гг. Авангардысцкія тэндэнцыі і "рэвалюцыя ў паэзіі" "Маладняка" і "Узвышша". Уплыў мадэрнісцкіх плыняў і рэформа верша. Традыцыйнае і наватарскае, эпічнае і лірычнае ў паэмах Якуба Коласа, Міхася Чарота, Паўлюка Труса, Міхайлы Грамыкі, Язэпа Пушчы, Уладзіміра Жылкі, Уладзіміра Дубоўкі, Андрэя Александровіча і інш. Сатырычная творчасць К. Крапівы.

**Проза 20-х гадоў**. Жанрава-стылёвае станаўленне і развіццё беларускай прозы 20-х гг. Творчы росквіт апавядання як жанру. Засваенне новай тэматыкі. Творчасць К. Чорнага, М. Зарэцкага, К. Крапівы, М. Лынькова, Р. Мурашкі, П. Галавача, Я. Скрыгана ў жанры апавядання. Жанравае станаўленне беларускай аповесці і рамана. Аўтабіяграфізм, дакументалізм, псіхалагізм, філасафізм як прыкметы буйных твораў Я. Коласа, З. Бядулі, М. Гарэцкага, Ц. Гартнага, К. Чорнага, М. Зарэцкага, Я. Нёманскага, Р. Мурашкі і інш. Творчыя дасягненні сатырычнай прозы Я. Коласа, К. Крапівы, Ц. Гартнага, М. Зарэцкага і інш.

**Драматургія 20-х гг. і станаўленне беларускага прафесійнага тэатра**. Агляд творчасці Я. Купалы, Ф. Аляхновіча, У. Галубка, М. Гарэцкага, Е. Міровіча, М. Грамыкі, Я. Дылы, М. Чарота, Л. Родзевіча, Р. Кобеца і інш.

**Беларуская савецкая літаратура 30-х гг**. Беларуская літаратура 30-х гг. як каштоўны матэрыял для разумення і асэнсавання гісторыі. Адлюстраванне ў ёй стану грамадства, атмасферы часу. Багацце фактаграфізму. Арыентацыя на станоўчы ідэал жыцця. Рамантычныя памкненні маладога пакалення. Ідэалізацыя рэчаіснасці. Літаратурныя спрэчкі і дыскусіі. Дзейнасць на пачатку 30-х гг. БелАПП. Вульгарна-сацыялагічная крытыка. Дзяржаўна-партыйнае кіраўніцтва літаратурай і культурай. Стварэнне Саюза пісьменнікаў БССР. Лёс беларускіх пісьменнікаў у 30-я гг. Сутыкненні веры, ілюзій і рэальнасці. Рэпрэсаваныя літаратары, іх творчая спадчына. Савецкая ідэалогія і яе адбітак на мастацкай свядомасці. Праблемы станаўлення пісьменніцкай індывідуальнасці ва ўмовах даваеннага часу. Паэзія 30-х гг.: пафас, вобразы, рытмы і настроі. Ідэйна-тэматычны змест беларускай прозы. Стан беларускай драматургіі 30-х гг. Канцэпцыя беларускага селяніна і сялянства. Выяўленне пісьменнікамі сутнасных асноў нацыянальнага менталітэту. Сутыкненне старога і новага, драматызацыя эпасу.

Адметнасць формаў і прыёмаў мастацкага мыслення ў творчасці пісьменнікаў. Працяг і развіццё традыцый. Літаратура для дзяцей.

**Літаратура Заходняй Беларусі**. Гістарычныя абставіны фарміравання заходнебеларускай літаратуры. Пісьменнікі-“нашаніўцы” і іх роля ў фарміраванні традыцый паэзіі, прозы, драматургіі, публіцыстыкі ў літаратуры Заходняй Беларусі. Дамінаванне публіцыстыкі і паэзіі. Творчасць М. Танка, М. Машары, П. Пестрака, В. Таўлая і інш.

**Літаратура часу Вялікай Айчыннай вайны**. Лёс Беларусі ў вайне. Баі на тэрыторыі Беларусі. Гераізм савецкіх людзей. Вайна і літаратура. Пісьменнікі-франтавікі, удзельнікі партызанскага і падпольнага руху. Творчасць паэтаў, якія загінулі ў гады вайны. Складанасць ваенных падзей і калізій у адлюстраванні літаратуры. Франтавы і партызанскі друк. Фальклор ваеннага часу. Асноўныя дасягненні ў публіцыстыцы (у тым ліку сатыры), паэзіі, прозе, драматургіі.

**Беларуская літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя (1945—1955).** Умовы і асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў пасляваенны час. Патрыятычны і жыццялюбны пафас творчасці, абумоўлены заканчэннем вайны, мірным будаўніцтвам. Сацыялістычны рэалізм і яго ўздзеянне на развіццё тагачаснай літаратуры. Адбітак тэорыі бесканфліктнасці на творчай практыцы пісьменнікаў. Станаўленне ў пасляваенны час творчых індывідуальнасцей. Чалавек, час, эпоха ў тагачасных кнігах паэзіі. Паэтычныя прамова, верш-зварот, верш-заклік. Каштоўнасць лірызму ў паглыбленні асабовага пачатку і эстэтыкі ўсёй паэзіі. Праявы неарамантызму і імажынізму (М. Танк, А. Вялюгін, інш.). Вайна, калгасная рэчаіснасць, пасляваеннае жыццё ў адлюстраванні беларускай прозы 1945—1955 гг. Развіццё мастацкай дакументалістыкі і мемуарыстыкі. Паступовае пашырэнне тэматычных аспектаў і стылёва-выяўленчых магчымасцей беларускай паэзіі і прозы. Жанравая разнапланавасць драматургіі пасляваеннага часу, найбольш значныя п’есы.

**Беларуская літаратура другой паловы 50-х — 60-х гадоў.** Сярэдзіна 50-х гг. у гісторыі літаратуры і культуры як пачатак якасна новага перыяду развіцця. Уплыў грамадскай “адлігі” на развіццё мастацтва слова. Рэабілітацыя рэпрэсаваных пісьменнікаў, аднаўленне гістарычнай панарамы беларускай літаратуры. Разгортванне літаратурнага працэсу ў 60-я гг., яго шматвектарнасць. Прыход у літаратуру новага пісьменніцкага пакалення — “філалагічнага”. Мадэрнізацыя мастацкага мыслення. Наватарская адметнасць “Новай кнігі” А. Куляшова, вершаванага зборніка “Акно” П. Макаля і інш. Шматграннае тэматычнае і стылёвае развіццё прозы, узмацненне яе аналітыка-даследчыцкіх магчымасцей. Росквіт беларускага рамана, набыткі ў жанры аповесці, багацце мастацкай навелістыкі. Узмацненне рэалістычна-псіхалагічных асноў ваеннай прозы. Народнае жыццё, чалавек і зямля ў вясковай прозе. Якасна новая ступень гістарызму ў беларускай літаратуры. Праблемна-тэматычныя і жанравыя абсягі драматургіі другой паловы 50-х — 60-х гг.

**Беларуская літаратура 70-х — першай паловы 80-х гадоў.** Культурная і ідэйна-мастацкая пераемнасць беларускай літаратуры 70—80-х гг. з мастацкімі традыцыямі нацыянальнага слоўнага мастацтва. Пашырэнне тэматыкі ў літаратуры, яе жанрава-стылёвае развіццё (гістарычны раман, раман-хроніка, раман-эсэ і інш.). Крызісныя моманты ў развіцці мастацтва слова, спробы пераадолення іх. Эстэтычныя набыткі беларускай паэзіі, паглыбленне ў ёй суб'ектыўнага пачатку, культуры творчасці. "Празаізацыя" паэзіі. Сацыяльна-маральныя тыпы герояў у тагачаснай беларускай прозе. Асэнсаванне пісьменнікамі гістарычнага мінулага. Гуманістычная канцэпцыя чалавека ў прозе вайну, узмацненне ў ёй псіхааналітычных тэндэнцый. Маральна-этычная заглыбленасць мастацкіх канфліктаў. Эстэтычная адметнасць сатырычных і гумарыстычных твораў. Развіццё ліра-эпасу, яго ідэйна-мастацкі змест: сацыяльнае, нацыянальнае, гістарычнае. Мастацкая навелістыка, адлюстраванне ў ёй духоўнага свету асобы. Стан тагачаснай беларускай драматургіі, яе жанрава-стылёвыя асаблівасці развіцця.

**Сучасная літаратура Беларусі (з сярэдзіны 80-х гадоў).** Сучасны этап літаратурнага развіцця: заканамернасці і тэндэнцыі. Традыцыі і наватарства ў сучаснай беларускай літаратуры. Літаратурна-выдавецкі працэс у сучаснай Беларусі. Чалавек, жыццё і час у мастацкай літаратуры, актуальнасць і надзённасць твораў на сучасную тэму. Трывога пісьменнікаў пра вечныя духоўныя каштоўнасці, захаванне гуманізму. Асэнсаванне пісьменнікамі гісторыі і лёсу беларускага народа ў XX ст. Уплыў чарнобыльскай трагедыі на светаадчуванне беларускіх пісьменнікаў. Эстэтыка-выяўленчыя кірункі, плыні, тэндэнцыі: рэалізм, неарамантызм, авангардызм, імпрэсіянізм, постмадэрнізм і інш. Выяўленне пісьменнікамі розных аспектаў чалавечага быцця: маральнага, сацыяльнага, гістарычнага, рэлігійнага і інш. Традыцыя інтэлектуалізму і яе ўплыў на паэзію. Паяднанне публіцыстычнага, філасофскага і інтымна-псіхалагічнага пачаткаў у лірыцы. Багацце духоўнага зместу ў сучаснай паэзіі. Міфатворчасць беларускіх паэтаў. Беларуская паэма на сучасным этапе: жанравая сінтэтычнасць, разнастайнасць мастацкіх формаў. Актывізацыя ідэйна-творчых пошукаў, пашырэнне выяўленчых магчымасцей беларускай прозы 80—90-х гг. Новыя падыходы ў адлюстраванні падзей мінулага і сучаснасці. Даследаванне сацыяльных працэсаў, узмацненне ўвагі да маральна-псіхалагічных, экалагічных і агульначалавечых праблем. Формы і прыёмы мастацкай умоўнасці. Агульныя тэндэнцыі ў развіцці сучаснай нацыянальнай драматургіі. Беларускае мастацкае слова ў сусветнай культурнай прасторы.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

### ЛІТАРАТУРА XI — XIX стст.

Навуковая літаратура

**Александровіч С.Х.** Пуцявіны роднага слова. — Мн., 1971.

**Арлоў У.А.** Ефрасіння Полацкая. — Мн., 1992.

**Багдановіч І.Э.** Авангард і традыцыя: Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння. — Мн., 2001.
**Багдановіч М.А.** Беларускае Адраджэнне. Літаратурныя артыкулы. — Мн., 1994.

**Багушэвіч Ф.** // Крыніца. — 1995.— № 11-12 (16).
**Барысенка В.** Францішак Багушэвіч і праблема рэалізма ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя. — Мн., 1957.
**Булахаў М.Г.** "Слова пра паход Ігаравы" і Беларусь: У 2 ч. — Мн., 2000.

**Вечна жывое** "Слова". — Мн., 1989.

**Гаранін С.Л.** Шляхамі даўніх вандраванняў. Гістарычна-тэарэтычны нарыс развіцця беларускай паломніцкай літаратуры XII—XVI стст. — Мн., 1999.

**Грынчык М.М.** Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі. — Мн., 1969.
**Дорошкевич В.И.** Новолатинская поэзия Белоруссии и Литвы: Первая половина XVI в. — Мн., 1979.

**Ермаловіч М.** Старажытная Беларусь. — Мн., 1994.

**Жураўлёў В.П.** У пошуках духоўных ідэалаў.На матэрыяле беларускай літаратуры XIX — пачатку XX ст. — Мн., 2000.
**Каваленка В.А.** Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. — Мн., 1975.
**Каваленка В.А.** Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры. — Мн., 1981.
**Кавалёў С.В.** Гераіка-эпічная паэзія Беларусі і Літвы канца XVI ст. — Мн., 1993.

**Кавалёў С.В.** Літаратура Беларусі позняга Рэнесансу: жанры, творы, асобы. — Мн., 2005.

**Кавалёў С.В**. Станаўленне польскамоўнай паэзіі ў полілінгвістычнай літаратуры Беларусі эпохі Рэнесансу. — Мн., 2002.

**Казакова Т.П.** Мітрапаліт Вялікага Княства Літоўскага: Рыгор Цамблак // Вяртання маўклівая споведзь. Постаці творцаў гісторыі ў кантэксце часу. — Мн., 1994.

**Казбярук У.** Ступені росту: Беларуская літаратура канца XIX — пачатку XX ст. і традыцыі польскіх пісьменнікаў. — Мн., 1974.
**Калеснік У.** Тварэнне легенды. — Мн., 1987.

**Карский Е.Ф.** Белорусы. Т. 3. Вып. 2. — Пг., 1921.

**Киркор А.Г.** Живописная Россия. Т. 3. Ч. 1—2. С.-СПб., 1882.

**Киселёв Г.** Разыскивается классик...: Историко-литературная дилогия. — Мн., 1989.
**Кісялёў Г.** Ад Чачота да Багушэвіча. — Мн., 1993; 2003.
**Кісялёў Г.** Героі і музы. — Мн., 1982.
**Кісялёў Г.** Пошукі імя. — Мн., 1978.
**Кісялёў Г.** Радаводнае дрэва. — Мн., 1994.
**Кісялёў Г.** Сейбіты вечнага. — Мн., 1963.
**Кісялёў Г.** Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча. — Мн., 1988.
**Конан У.М.** "Паче всех воссиявший…" // Крыніца. — 1994. — № 1.

**Конон В.М.** От ренессанса к классицизму. — Мн., 1978.

**Короткий В.Г.** Творческий путь Мелеция Смотрицкого. — Мн., 1987.

**Коршунов А.Ф.** Афанасий Филиппович: Жизнь и творчество. — Мн., 1965.

**Лазарук М.А.** Станаўленне беларускай паэмы. — Мн., 1968.
**Ларчанка М.** Па шляху рэалізма. — Мн., 1959.
**Левшун Л. В.** История восточнославянского книжного слова XI--XVII вв. — Мн., 2001.

**Левшун Л.** Леонтий Карпович: Жизнь и творчество. — Мн., 2001.

**Лихачёв Д.С.** "Слово о полку Игореве" и культура его времени. — М., 1978.

**Лихачёв Д.С.** Поэтика древнерусской литературы. — М., 1979.

**Лихачёв Д.С.** Развитие русской литературы X—XVII вв. Эпохи и стили. — Л., 1973.

**Лихачёв Д.С.** Человек в литературе Древней Руси. — М., 1970.

**Майхрович С.К.** Жизнь и творчество Ф. Богушевича. — Мн., 1961.
**Мальдзіс А.** Падарожжа ў XIX стагоддзе. — Мн., 1969.
**Мальдзіс А.** Таямніцы старажытных сховішчаў. — Мн., 1974.
**Мальдзіс А.** Творчае пабрацімства. — Мн., 1966.
**Мальдзіс А.** Традыцыі польскага Асветніцтва ў беларускай літаратуры XIX ст. — Мн., 1972.
**Мальдзіс А.І.** На скрыжаванні славянских традыцый: Літаратура Беларусі пераходнага перыяду: другая палавіна XVII—XVIII ст. — Мн., 1980.

**Мархель У.** Вяшчун славы і волі: Уладзіслаў Сыракомля. — Мн., 1989.
**Мархель У.** Лірнік вясковы: Сыракомля ў беларуска-польскім літаратурным узаемадзеянні. — Мн., 1983.
**Мархель У.** Прысутнасць былога. — Мн., 1997.
**Мархель У. І.** Крыніцы памяці: Старонкі беларуска-польскага літаратурнага сумежжа. — Мн., 1990.
**Мельников А.А.** Путь непечален. Исторические свидетельства о святости Белой Руси. — Мн., 1992.

**Мельнікаў А.А.** З неапублікаванай спадчаны. — Мн., 2005.

**Мельнікаў А.А.** Кірыл, епіскап Тураўскі: Жыцце, спадчына, светапогляд. — Мн., 1997.

**Міско С.М.** Школьны тэатр Беларусі XVI — XVIII в. — Мн., 2000.

**Навуменка І. Я.** Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. — Мн., 1992.
**Навуменка І. Я.** Пісьменнікі-дэмакраты. — Мн., 1967.
**Падокшын С. А.** Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры. — Мн.,2003.

**Падокшын С. А.** Іпацій Пацей: царкоўны дзеяч, мысліцель, пісьменнік. — Мн., 2001.

**Парэцкі Я. І.** Ян Вісліцкі. — Мн., 1991.

**Порецкий Я. И.** Николай Гусовский. — Мн., 1984.

**Порецкий Я. И.** Соломон Рысинский: конец XVI — начало XVII в. — Мн., 1983.

**Родчанка Р.** Альгерд Абуховіч: Нарыс жыцця і творчасці. — Мн., 1984.
**Рыбаков Б. А.** Петр Бориславич. Поиск автора “Слова о полку Игореве”. — М., 1991.

**Саверчанка І. В.** Апостал яднання і веры: Язэп Руцкі. — Мн., 1994.

**Саверчанка І. В.** Канцлер Вялікага Княства: Леў Сапега. — Мн., 1992.

**Саверчанка І. В.** Старажытная паэзія Беларусі: XVI — першая палова XVII ст. — Мн., 1992.

**Саверчанка І. В.** Сымон Будны — гуманіст і рэфарматар. — Мн., 1993.

**Саверчанка І. В.**: Кніжна-пісьмовая культура Беларусі. Адраджэнне і ранняе барока. — Мн., 1998.

**Самбук С. М.** Общественно-политическая мысль Белоруссии во второй половине XIX века. — Мн., 1976.
**Семашкевіч Р. М.** Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбургу: Канец XIX — пачатак XX ст. — Мн., 1971.
**Семяновіч А.А.** Гісторыя беларускай драматургіі. XIX — пачатак XX ст. — Мн., 1985.
**Скарына** і яго час. — Мн., 1990.

**Словарь** книжников и книжности Древней Руси: XI—первая половина XIV века. Л., 1987.

**Содаль У.** Сцежкамі Мацея Бурачка. — Мн., 1991.
**Тарасюк Л. К.** Апалогія красы: Кніга пра беларускую паэзію. — Мн., 2003.
**Творчасць Элізы Ажэшкі** і беларуская культура: Зборнік навуковых прац. Гродна, 2002.
**Улащик Н. Н.** Введение в изучение белорусско-литовского летописания. — М., 1985.

**Усікаў Я.** Беларуская камедыя. — Мн., 1979.
**Францыск Скарына** і яго час: Энцыклапедычны даведнік. — Мн., 1988.

Хромчанка К.Р. Беларуская мастацкая проза (канец XIX — пачатак XX ст.). — Мн., 1979.
**Цвірка К. А.** Лісце забытых алеяў: Эсэ. — Мн., 1993.
**Цвірка К. А.** Слова пра Сыракомлю: Быт і культура беларусаў у творчасці “вясковага лірніка”. — Мн., 1975.
**Цьвікевіч А.** “Западно-руссизм”. — Мн., 1993.
**Чамярыцкі В. А.** Беларускія летапісы як помнікі літаратуры. — Мн., 1969.

**Шалькевич Ф.** Кастусь Калиновский: Страницы биографии. — Мн., 1988.
**Шахматов А. А.** "Повесть временных лет" и ее источники // ТОДРЛ. М.-Л., 1940. Т. 4.

**Штэйнер І. Ф.** Беларуская балада. — Мн., 1989.
**Штэйнер І. Ф.** Шматмоўная літаратура Беларусі XIX стагоддзя. — Мн., 2002.
**Янка Лучына** ў кантэксце самаідэнтыфікацыі беларускай літаратуры: Матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі. — Мн., 2002.
**Янушкевіч Я.** Беларускі Дудар. — Мн., 1991.
**Янушкевіч Я.** За архіўным парогам. — Мн., 2002.
**Янчук М. А.** Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры. Старадаўні перыяд. — Мн., 1922.

**Яскевич А. С.** Становление белорусской художественной традиции. — Мн., 1987.

**Яскевіч А. А.** Абранне вечнасці. Універсалізм традыцыі і гістарызм сучаснасці. — Мн., 1999.

**Яскевіч А.** Падзвіжнікі і іх святыні. — Мн., 2001.

## ЛІТАРАТУРА XX — пачатку XXI стст.

Навуковая літаратура

*Асноўная*

**Адамовіч А.** "Браму скарбаў сваіх адчыняю..." — Мн., 1980.

**Адамовіч А. М.** Маштабнасць прозы: Урокі творчасці Кузьмы Чорнага. — Мн., 1972.

**Адамович А.** Ничего важнее: Соврем. пробл. воен. прозы. — 2-е изд. — Мн., 1987.

**Александровіч С.** Слова — багацце: Літ.-крытыч. арт. — Мн., 1981.

**Александровіч С. Х., Александровіч В. С.** Беларуская літаратура XIX — пачатку XX ст.: Хрэстаматыя крытыч. матэрыялаў. — Мн., 1978.

**Андраюк С.** А жыццё — вышэй за ўсё: Выбр. — Мн., 1992.

**Андраюк С.** Чалавек на зямлі: Нарыс творчасці І. Пташнікава. — Мн., 1987.

**Арабей Л.** Стала песняй у народзе: Жыццё і творчасць Цёткі. — 2-е выд., дап. і дапрац. — Мн., 1998.

**Арочка М.** Максім Танк: Жыццё ў паэзіі. — Мн., 1984.

**Афанасьев И.** Кто восходит на Голгофу?: Антывоенная идея в творчестве В. Быкова. — Мн., 1993.

**Афанасьеў І.** Чарнобыльскае светаадчуванне ў сучаснай беларускай літаратуры. — Мн., 2001.

**Багдановіч І. Э.** Авангард і традыцыя: Бел. паэзія на хвалі нац. адраджэння. — Мн., 2001.

**Багдановіч І. Э.** Янка Купала і рамантызм. — Мн., 1989.

**Беларускія пісьменнікі і літаратурны працэс 20—30-х гадоў. — Мн., 1985.**
**Беларуская літаратура: XI—XX стст.:** Дапам. для шк., ліцэяў, гімназій, ВНУ / А. І. Бельскі, У. Г. Кароткі, П. І. Навуменка і інш. — 2-е выд., дапрац. — Мн., 2001.

**Беларускія пісьменнікі (1917):** Даведнік / Склад. А. К. Гардзіцкі. — Мн., 1994.

**Беларускія пісьменнікі:** Біябібліягр. слоўнік: У 6 т. — Мн., 1992—1995.

**Бельскі А. І.** Сучасная беларуская літаратура: Станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцяў (80—90-я гг.): Дапам. для настаўнікаў. — Мн., 1997.

**Бельскі А.** Свет ад травы да зор: Сістэма вобразаў прыроды, паэтыка пейзажу: Дапам. для настаўнікаў. — Мн., 1998.

**Бельскі А.** Сучасная літаратура Беларусі: Дапам. для настаўнікаў. — Мн., 2000.

**Бечык В.** Выбранае. — Мн., 1989.

**Бечык В.** Шлях да акіяна: Кн. пра паэзію А. Куляшова. — Мн., 1981.

**Бугаёў Д.** Вернасць прызванню: Творчая індывідуальнасць І. Мележа. — Мн., 1977.

**Бугаёў Д.** Зброяй сатыры, зброяй праўды. — 2-е выд., выпр. і дап. — Мн., 2004.

**Бугаёў Д.** Максім Гарэцкі. — 2-е выд., выпр. і дап. — Мн., 2003.

**Бугаёў Д.** Паэзія Максіма Танка. — 2-е выд., выпр. і дап. — Мн., 2003.

**Бугаёў Д.** Праўда і мужнасць таленту: Выбранае. — Мн., 1995.

**Бугаёў Д.** Уладзімір Дубоўка: Кн. пра паэта. — Мн., 2005.

**Бярозкін Р.** Аркадзь Куляшоў: Нарыс жыцця і творчасці. — Мн., 1978.

**Бярозкін Р.** Паэзія — маё жыццё: Літ.-крытыч. арт. — Мн., 1989.

**Бярозкін Р.** Свет Купалы. Звенні: Літ. крытыка: Выбр. — Мн., 1981.

**Бярозкін Р.** Чалавек напрадвесні: Расказ пра Максіма Багдановіча. — Мн., 1986.

**Васючэнка П. В.** Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм. — Мн., 2004.

**Васючэнка П. В.** Драматургічная спадчына Янкі Купалы. — Мн., 1994.

**Васючэнка П.** Пошукі страчанага дзяцінства: Бел. празаікі “сярэд. пакалення” аб Вялікай Айчыннай вайне. — Мн., 1995.

**Васючэнка П.** Сучасная беларуская драматургія. — Мн., 2000.

**Верабей А.** Абуджаная памяць: Нарыс жыцця і творчасці У. Караткевіча. — Мн., 1997.

**Верабей А. Л.** Максім Танк і польская літаратура. — Мн., 1984.

**Верабей А.** Уладзімір Караткевіч: Жыццё і творчасць. — 2-е выд., дапрац. і выпраўл. — Мн., 2005.

**Гарадніцкі Я. А.** Думка і вобраз: Праблема інтэлектуалізму ў сучас. беларус. лірыцы. — Мн., 1986.

**Гаранін Л. Я.** Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя. — Мн., 1996.

**Гарэлік Л.** Зямля дала мне права: Станаўленне творчай індывідуальнасці Р. Барадуліна. — Мн., 1983.

**Гарэцкі М.** Гісторыя беларускае літаратуры. — Мн., 1992.

**Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя:** У 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. — Мн., 1999—2003. — Т. 1: 1901—1920; — Т. 2: 1921—1941; — Т. 3: 1941—1965; — Т. 4, кн. 1: 1966—1985; кн. 2: 1986—2000 .

**Гісторыя беларускай літаратуры: XIX — пачатак XX ст.**: / Пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. — 2-е выд., дапрац. — Мн., 1998.

**Гісторыя беларускай літаратуры: XX стагоддзе: 20—50-я гг.:** / Пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. 2-е выд., дапрац. — Мн., 2000.

**Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: 1941—1980** / Пад агул. рэд. М. А. Лазарука і А. А. Семяновіча. — Мн., 1983.

**Гіламёдаў У**. Ад даўніны да сучаснасці: Нарыс пра беларус. паэзію. — Мн., 2001.

**Гіламёдаў У. В.** Янка Купала: Жыццё і творчасць. — Мн., 2002.

**Гіламёдаў У.** Іван Мележ: Нарыс жыцця і творчасці. — Мн., 1984.

**Гіламёдаў У**. Класікі і сучаснікі: Арт., нарысы, старонкі ўспамінаў. — Мн., 1987.

**Грамадчанка Т. К.** Жывая памяць народа: Нарыс творчасці І. Чыгрынава. — Мн., 1984.

**Грамадчанка Т. К.** Перад праўдай высокай і вечнай: Бел. проза сёння. — Мн., 1991.

**Гурэвіч Э. С.** Янка Маўр: Нарыс жыцця і творчасці. — 2-е выд., дапрац. — Мн., 2004.

**Дасаева Т. М.** Летапіс жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага. — Мн., 1993.

**Дзюбайла П.** Панарама сучаснай беларускай прозы. — Мн., 1986.

**Драздова З. У.** Творчасць А. Мрыя і А. Калюгі: Стылявыя асаблівасці. — Мн., 1997.

**Драздова З. У.** Майстэрства слова: Моўна-стылявыя асаблівасці "Палескай хронікі" І. Мележа. — Мн., 1993.

**Жук І.** Сустрэчны рух: Літаратуразн. эцюды. — Гродна, 1998.

**Жураўлёў В. П.** На шляху духоўнага самасцвярджэння. — Мн., 1995.

**Жураўлёў В. П.** У пошуку духоўных ідэалаў: На матэрыяле бел. літ. XIX — пачатку XX ст. — Мн., 2002.

**Жураўлёў В. П.** Якуб Колас і паэтыка беларускага рамана. — 2-е выд., выпр. і дап. — Мн., 2004.

**Замоцін І. І.** Творы: Літ.-крытыч. арт. — Мн., 1991.

**Каваленка В.** Веліч праўды: Выбранае. — Мн., 1989.

**Каваленка В.** Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. — Мн., 1975.

**Каваленка В.** Іван Шамякін: Нарыс жыцця і творчасці. — Мн., 1980.

**Каваленка В.** Міфапаэтычныя матывы ў беларускай літаратуры. — Мн., 1981.

**Коваленко В. А.** Общность судеб и сердец: Бел. проза о Великой Отечественной войне в контексте русской и других литератур. — Мн., 1985.

**Кавалёў С.** Партрэт шкла: Літ.-крытыч. арт. — Мн., 1991.

**Казбярук У. М.** Рамантычны пошук: Назіранні над бел. рамантызмам пачатку XX ст. — Мн., 1983.

**Казбярук У. М.** Светлай волі зычны звон: А. Гарун. — Мн., 1991.

**Калеснік У.** Ветразі Адысея: У. Жылка і рамантыч. традыцыя ў бел. паэзіі. — Мн., 1977.

**Калеснік У.** Зорны спеў: Літ. партрэты, нарысы, эцюды. — Мн., 1981.

**Калеснік У.** Максім Танк: Нарыс жыцця і творчасці. — Мн., 1981.

**Калеснік У.** Тварэнне легенды: Літ. партрэты і нарысы. — Мн., 1987.
**Калеснік У.** Усё чалавечае: Літ.-крытыч. арт. — Мн., 1993.

**Калеснік У.** Янка Брыль: Нарыс жыцця і творчасці. — Мн., 1990.

**Канэ Ю.** Плынь: Літ. крытыка. — Мн., 1983.

**Канэ Ю.** Як паветра і хлеб: Жыццёвы і творчы шлях Я. Брыля. — Мн., 1988.

**Кісліцына Г.** Алесь Разанаў: Праблема мастацкай свядомасці. — Мн., 1997.

**Козіч В. І.** Чалавек і прырода ў сучаснай беларускай прозе. — Мн., 1998.

**Колас Г**. Аўтографы Андрэя Макаёнка. — Мн., 1992.

**Конан У.** Ля вытокаў самапазнання: Станаўленне духоўных каштоўнасцей і фальклор. — Мн., 1989.
**Конан У.** Святло паэзіі і цені жыцця: Лірыка М. Багдановіча. — Мн., 1991.
**Коўтун В.** Стала песняй у народзе: Нарыс жыцця і творчасці Цёткі. — Мн., 1998.
**Лазарук М. А.** Беларуская паэма ў другой палавіне XIX — пачатку XX стагоддзя. — Мн., 1970.
**Лаўшук С.** Кандрат Крапіва і беларуская драматургія. — 2-е выд. — Мн., 2002.

**Лецка Я.** Хараство і боль жыцця: Нарыс творчасці В. Адамчыка. — Мн., 1985.

**Лойка А. А.** Гісторыя беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд: У 2 ч. — 2-е выд., дапрац. і дап. — Мн., 1989. — Ч. 2.

**Лойка А. А.** Паэзія і час: Літ.-крытыч. арт. — Мн., 1981.

**Лойка А.** Галгофа: Кн. лёсаў. — Слонім, 2001.

**Локун В. І.** Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы, 1950—1960-я гг. — Мн., 1995.

**Локун В.** Кругі жыцця — кругі літаратуры. — Мн., 2002.

**Лысенка А.** Лінія гарызонта: Нарыс творчасці Я. Сіпакова. — Мн., 1986.

**Лявонава Е. А.** Агульнае і адметнае: Творы беларус. пісьменнікаў XX ст. у кантэксце сусветнай літаратуры. — Мн., 2004.

**Макарэвіч А. М.** Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX — пачатку XX ст. — Магілёў, 1999.

**Максімовіч В. А.** Шыпшынавы край: Старонкі бел. літ. 20—30-х гг. XX ст.: Дапам. для наст. — Мн., 2002.

**Максімовіч В. А**. Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя: Дапам. для студэнтаў філал. фак. ВНУ. — Мн., 2000.

**Мальдзіс А.** Жыцце і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: Партр. пісьменніка і чалавека. — Мн., 1990.

**Марціновіч А. А.** Шляхам праўды: Выбр. старонкі бел. літ. у святле сённяшняга дня: Дапам. для настаўніка. — Мн., 1994.

**Марціновіч А.** Іван Чыгрынаў: Нарыс жыцця і творчасці. — Мн., 1998.

**Мельнікава З. П.** "На горне душы...": Творчасць З. Бядулі і бел. літ. першай трэці XX ст. — Брэст, 2001.

**Мікуліч М. У.** Максім Танк і сучасная беларуская лірыка. — Мн., 1994.

**Мішчанчук М. І.** Беларуская савецкая паэзія 20—30-х гадоў. — Мн., 1988.

**Мішчанчук М. І.** Ёсць у паэта свой аблог цалінны: Жанрава-стылявая разнастайнасць сучас. беларус. лірыкі. — Мн., 1992.

**Мішчанчук М. І., Шпакоўскі І. С.** Беларуская літаратура XX ст.: Вучэб. дапам. — Мн., 2001.

**Мушынскі М. І.** І нічога, апроч праўды: Якой быць "Гісторыі беларускай літаратуры". — Мн., 1990.

**Мушынскі М. І.** Якуб Колас: Летапіс жыцця і творчасці. — Мн., 1982.

**Мушынскі М.** Нескароны талент: Праўдзівая гісторыя жыцця і творчасці М. Зарэцкага. — 2-е выд. — Мн., 2005.

**Навуменка І.** Змітрок Бядуля. — 2-е выд. — Мн., 2004.

**Навуменка І. Я.** Максім Багдановіч. — Мн., 1997.

**Навуменка І. Я.** Ранні Кузьма Чорны (1923—1929). — Мн., 2000.

**Навуменка І. Я.** Якуб Колас: Духоўны воблік героя. — 2-е выд., дапрац. і перапрац. — Мн., 1981.

**Навуменка І. Я.** Якуб Колас: Нарыс жыцця і творчасці — 2-е выд., са змяненнямі. — Мн., 2003.

**Навуменка І. Я.** Янка Купала. — 2-е выд., дап. — Мн., 1980.

**Навумовіч У. А.** Шляхамі арлянят: Проза "Маладняка". — Мн., 1984.

**Нарысы беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей:** Культур.-гіст. і літ. аспекты прабл. / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. — Мн., 2002.

**Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей:** У 4 кн. / АН Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. — Мн., 1993—1995. — Кн. 2—4.

**Піскун Л.** Іван Навуменка. — Мазыр, 1997.

**Пяткевіч А**. Сюжэт. Кампазіцыя. Характар: Аб прозе Кузьмы Чорнага. — Мн., 1981.

**Рагуля А.** Імгненні… — Мн., 1990.

**Рагойша В.** І адгукнецца слова ў слове: Літ.-крытыч. арт., эсэ, дыялогі. — Мн., 1992.
**Рагойша В. П.** Вяршыні: З невядомага і забытага пра Я. Купалу, Я. Коласа і М. Багдановіча. — Мн., 1991.
**Русецкі А.** Уладзімір Караткевіч: Праз гісторыю ў сучаснасць. — Мн., 2000.

**Сабалеўскі А. В.** Кандрат Крапіва: Постаць і творы. — 2-е выд., дапрац. і дап. — Мн., 2003.

**Сачанка Б.** Сняцца сны аб Беларусі: Літ.-крытыч. арт. — Мн., 1990.

**Семяновіч А. А.** Гісторыя беларускай драматургіі: XIX — пачатак XX ст. — Мн., 1985.

**Семяновіч А. А.** Гісторыя беларускай савецкай драматургіі: 1917—1955 гг. — Мн., 1990.

**Сіненка Г.** Іван Навуменка: Нарыс творчасці. — Мн., 1981.

**Сіненка Г.** Ніл Гілевіч: Нарыс творчасці. — Мн., 1981.

**Стральцоў М.** Загадка Багдановіча. — Мн., 1969.

**Тарасюк Л.** Апалогія красы: Кн. пра беларускую паэзію. — Мн., 2003.

**Тарасюк Л. К.** Мастацкія кірункі і плыні ў беларускай паэзіі XIX — пачатку XX стст. — Мн., 1999.

**Тычына М. А.** Аляксандр Пушкін і Якуб Колас. — Мн., 1999.

**Тычына М.** Карані і крона: Фальклор і літ. — 2-е выд. — Мн., 2002.

**Тычына М.** Кузьма Чорны: Эвалюцыя мастацкага мыслення. — 2-е выд., выпр. і дап. — Мн., 2004.

**Усікаў Я.** Андрэй Макаёнак: Нарыс жыцця і творчасці. — Мн., 1984.

**Хромчанка К. Р.** Беларуская мастацкая проза (канец XIX — пачатак XX ст.). — Мн., 1979.

**Чабан Т. К., Гарадніцкі Я. А.** Сучасная паэзія і фальклор. — Мн., 1988.

**Чарота І. А.** Пошук спрадвечнай існасці: Бел. літ. XX ст. у працэсах нац. самавызначэння. — Мн., 1995.

**Чыгрын І. П.** Крокі: проза “Узвышша”. Мн., 1989.

**Чыгрын І. П.** Проза “Маладняка”. — Мн., 1985.

**Чыгрын І. П.** Паміж былым і будучым: Проза Максіма Гарэцкага. — 2-е выд., выпр. — Мн., 2003.

**Чыгрын І. П.** Рэальнае і магчымае: Проза Якуба Коласа. — Мн., 1991.

**Шамякіна Т. І.** Беларуская класічная літаратурная традыцыя і міфалогія. — Мн., 2001.

**Шамякіна Т.** На лініі перасячэння: Літ.-крытыч. арт. — Мн., 1981.

**Шкраба Р.** Моваю вобразаў: Выбр. — Мн., 1989.

**Штэйнер І.** Балада: генезіс, эвалюцыя, перспектывы жанру. — Мн., 2003.

**Шупенька Г.** Прага мастацкасці: Выбр. — Мн., 1996.

**Шынкарэнка В. К.** Нястомных пошукаў дарога: Праблемы паэтыкі сучас. бел. гістарычнай прозы. — Мн., 2002.

**Юрэвіч У.** Выбранае. — Мн., 1987.

**Янка Купала:** Энцыкл. давед. — Мн., 1986.

**Янушкевіч Я.** Неадменны сакратар Адраджэння: В. Ластоўскі. — Мн., 1995.

**Ярош М. Р.** Пясняр роднай зямлі:Жыццё і творчасць Я. Купалы. — 2-е выд. — Мн., 2003.

**Яфімава М. Б.** Цэлы свет — дзецям: Творч. партрэт Я. Маўра — Мн., 1983.

*Дадатковая*

**Адамовіч А.** Здалёк і зблізку: Зб. літ.-крытыч. арт. — Мн., 1976.

**Адамовіч А.** Літаратура, мы і час: Арт. і выступленні. — Мн., 1979.

**Адамовіч А. М.** Беларускі раман: Станаўленне жанру. — Мн., 1961.

**Адамовіч Я. К.** Гармонія абставін — гармонія душы: Бел. апавяданне 50—60-х гг. — Мн., 1998.

**Александровіч С.** Кнігі і людзі: Даследаванні, архіўныя знаходкі, успаміны, эсэ. — Мн., 1976.

**Александровіч С.** Тут зямля такая. — 2-е выд., дапрац. і дап. — Мн., 1985.

**Алесь Адамовіч і час**: Матэрыялы Адамовічаўскіх чытанняў. — Мн., 1998.

**Андраюк С. А.** Традыцыі і сучаснасць. — Мн., 1981.

**Андраюк С.** Жыць чалавекам: Літ.-крытыч. арт. — Мн., 1983.

**Андраюк С.** Пісьменнікі. Кнігі: Літ.-крытыч. арт. — Мн., 1997.

**Арочка М. М.** Беларуская савецкая паэма. — Мн., 1979.

**Арочка М. М., Дзюбайла П. К., Лаўшук С. С.** На парозе 90-х: Літ. агляд. — Мн., 1993.

**Арочка М.** Пад высокай зоркай: Паэзія М. Ю. Лермантава ў творч. лёсе А. Куляшова. — Мн., 1990.

**Афанасьеў І.** Будзем садзіць сад...: Літ.-крытыч. арт. — Мн., 1991.

**Барадулін Р.** Парастак радка, галінка верша: Арт., эсэ. — Мн., 1987.

**Барсток М. М.** Адзінства і разнастайнасць сучаснай беларускай паэзіі. — Мн., 1973.

**Бачыла А.** Дарогамі Максіма Багдановіча. — 2-е выд., перапрац. і дап. — Мн., 1983.

**Беларуская савецкая проза:** Апавяданне і нарыс. — Мн., 1971.

Бочкарев В.А. Русская историческая драматургия XVII- XVIII вв. М., 1988.

Гуковский Г.А. Русская литература XVIII века. М., 1939.

Кочеткова Н.Д. Литература русского сентиментализма. СПб., 1994.

Лебедева О.Б. Русская литература XVIII века. М., 2000.

Лотман Ю. М. Беседы о русской литературе: Быт и традиции русского дворянства: XVIII — нчало XIX века. СПб., 1994.

Орлов П.А. История русской литературы XVIII века. М., 1991.

Развитие барокко и зарождение классицизма в России. М., 1989.

Фёдоров В.И. История русской литературы XVIII века. М., 1990.

## ИССЛЕДОВАНИЯ ПО КУРСУ ИСТОРИИ РУССКОЙ ЛИТЕРАТУРЫ XIX в.

История русской драматургии. Л., 1987.

История русской поэзии: В 2 тт., Л., 1968, 1969.

История русского романа: В 2 тт., М.-Л., 1962, 1964.

Кулешов В.И. История русской литературы XIX века. М., 1983.

Лотман К.Л Структура и типология русского стиха. Тарту. 2000.

Манн Ю. Динамика русского романтизма. — М., 1986.

Петров С.М. Русский исторический роман XIX века. М., 1984.

Развитие реализма в русской литературе: В 3 тт., М., 1972-1974.

Ревякин А.И. История русской литературы XIX века (первая половина). М., 1981.

Розанов В.В. О писателях и писательстве. М., 1995.

Русская повесть XIX века: История и проблематика жанра. Л., 1973.

Скафтымов А.П. Нравственные искания русских писателей. Статьи и исследования о русских классиках. М., 1972.

Словарь персонажей русской литературы. Вторая половина XVIII — XIX вв. СПб., 2000.

Набоков Лекции по русской литературе. М., 1996.

Караулов В.С.Словарь Пушкина и эволюция русской языковой способности. М., 1992.

Лотман Ю.М.В школе поэтического слова. Пушкин. Лермонтов. Гоголь.М.,1988.

Петрунина Н.Н.Пушкин в русской философской критике. М., 1990.

Сквозников В.Д.Пушкин. Историческая мысль поэта. М., 1998.

Томашевский Б.В.Пушкин. Работы разных лет. М., 1990.

Тынянов Ю.Н.Пушкин и его современники. М., 1969.

Фомичев С.А.Поэзия Пушкина. Творческая эволюция. Л., 1990.

Лермонтовская энциклопедия. М., 1981.

Белый А.Мастерство Гоголя. М., 1996.

Курляндская Г.Б.Художественный метод Тургенева-романиста. Тула, 1972.

Краснощекова Е.А.Иван Алексеевич Гончаров: мир творчества. Спб., 1997..

Журавлева А.И.А.Н. Островский-комедиограф. М., 1981.

Бойко М.И. Лирика Некрасова. М., 1977.

Тютчевский сборник: Статьи о жизни и творчестве Ф.И. Тютчева. Таллин, 1990.

Бухштаб Б.Я. А.А. Фет. Очерк жизни и творчества. Л., 1990.

Проблемы изучения жизни и творчества А.А. Фета. Межвуз. сборник. Курск, 1990.

Бахтин М.М. Проблемы поэтики Достоевского. М., 1979.

Янковский З.Я. Война и человек на войне в творчестве Л.Н. Толстого. Киев, 1978.

Лесков и русская литература. М., 1988.

Собенников А.С. Художественный символ в драматургии А.П. Чехова. Иркутск, 1989.

Чехониана. М., 2000.

Чехониана. М., 2003.

## ИССЛЕДОВАНИЯ ПО КУРСУ ИСТОРИИ

## РУССКОЙ ЛИТЕРАТУРЫ XX в.

Баран Х. Поэтика русской литературы нач. XX века. М., 1998.
Баевский В.С. История русской литературы XX века. М., 1999.
Буслакова Т.П. Литература русского зарубежья: Курс лекций. М., 2003.
Буренина О.Д. Символистский абсурд и его традиции в русской литературе и культуре первой половины XX века. СПб., 2005.
Герман М. Модернизм. Искусство первой половины XX века. СПб, 2003.
Русский символистский роман: аспекты поэтики. Киев, 1991.
Жолковский А. К. Блуждающие сны: Из истории русского модернизма. М., 1992.
История русской литературы: XX век: Серебряный век / Под ред. Ж. Нива. М., 1995.
А. Белый, В. Брюсов. М., 1997.
Лекманов О. Книга об акмеизме. Томск, 2000
Маковский С.К. На Парнасе Серебряного века. М., 2000.
Пайман А. История русского символизма. СПб., 1998.
Петров И. Акмеизм как художественная система. Екатеринбург, 2000.

Русская литература рубежа веков (1890-е – начало 1920-х годов). М., ИМЛИ РАН. Ч.1. 2000. Ч.2. 2001.
Сарычев В.А. Эстетика русского модернизма: проблема жизнетворчества. Воронеж, 1991.
Смирнова Л.А. Русская литература конца XIX- начала XX века. М. , 1993.
Соколов А.Г. Судьбы русской литературной эмиграции 1920-х годов. М., 1991.
Соколов А. Г. История русской литературы конца XIX- начала XX века. 4-е изд. М., 1999.
Ханзен-Лёве А. Русский символизм. СПб., 1999.
Русская литература XX века: Школы, направления, методы творческой работы. М.: Высш. школа, 2002.
Русская литература XX век: направления и течения. Вып. 2. Урал. госпединст., 1995.
Русская литература в зарубежных исследованиях (Розанов, Хлебников, Ахматова, Бахтин): Сб. обзоров. М., 1990.
Современная русская литература (1990- начало XXI в.): В 2 т. М., 2005.
Агеносов В.В. Литература Russkogo зарубежья. М.,1998.
Акимов В.М. От Блока до Солженицына. Судьбы русской литературы XX века (после 1917 г.). СПб, 1994.
Буслакова Т.Н. Литература Русского зарубежья: Курс лекций. М.: Высш. школа, 2003.
Гаспаров Б.М. Литературные лейтмотивы. Очерк русской литературы XX века. М., 1994 г.
Голубков М.М. Русская литература XX в. После раскола. М., 2001.
Гончарова-Грабовская С.Я. Комедия в русской драматургии конца XX — начала XXI века. М., 2006.
Гончарова-Грабовская С.Я. Поэтика современной русской драмы. Мн., 2003.
Громова М. И. Русская драматургия конца XX— начала XXI века. М., 2005.
Зайцев В.А. Русская поэзия XX века: 1940-1990 –е годы: Учеб.пособие. М.: МГУ, 2001.
Курицын В. Русский литературный постмодернизм. М., 2001.
Ланин Б. Проза русской эмиграции (третья волна). М: Нов. школа, 1997.
Литература русского зарубежья (1920-1990). Под ред. А.И.Смирновой. М., 2006.
Лейдерман Н.Л., Липовецкий М.Н. Современная русская литература: 1950-1990 –е годы: Учеб. пособие: В 2 т. М.: Academia, 2003.

Липовецкий М. Русский постмодернизм. Очерки исторической поэтики. Екатеринбург: Изд-во Екатеринбург. гос. ун-та, 1997.
Михайлов А.И. Пути развития новокрестьянской поэзии. Л., 1990.
Нефагина Г.Л. Русская проза конца XX века. М., 2005.
Павловский А.И. Советская философская поэзия: Очерки о Н. Заболоцком, Л. Мартынове, А. Твардовском. Л., 1984.
Петров С.М. Русский советский исторический роман. М., 1980.
Савицкий С. Андеграунд. М., 2002.
Скоропанова И.С. Поэзия в годы гласности. Мн., 1993.
Скоропанова И.С. Русская постмодернистская литература: Уч. пособие. М., 2004.
Соколов А.Г. Судьба русской литературной эмиграции 1920-х годов. М. 1991.
С разных точек зрения: социалистический реализм сегодня: Сб. М., 1990.
Струве Г.П. Русская литература в изгнании. М., 1996.
Чалмаев В. На войне остаться человеком: Фронтовые страницы русской прозы 1960 — 1990. М., 1998.
Юдин В. Современный русский исторический роман. Учеб. пособ. Калинин, 1990.

## ТЭОРЫЯ ЛІТАРАТУРЫ

## 1. ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА ЯК НАВУКА

### 1.1. Сістэма ведаў пра літаратуру

Літаратуразнаўства як філалагічная навука пра сутнасць, своеасаблівасць, гістарычныя заканамернасці развіцця, сацыякультурную ролю і прынцыпы аналізу мастацкай літаратуры. Абгрунтаванне самастойнасці і паўнавартаснасці літаратуразнаўства як асобнай навукі, якая мае ўласны *прадмет* даследавання, сваю *тэрміналогію* і *методыку* даследавання. Сувязь яго з іншымі гуманітарнымі навукамі – мовазнаўствам, эстэтыкай, фальклярыстыкай, гісторыяй, філасофіяй, мастацтвазнаўствам, журналістыкай, культуралогіяй, псіхалогіяй.

*Галоўныя галіны літаратуразнаўства*.

*Гісторыя літаратуры* і яе раздзелы: аўтаразнаўства, гісторыя нацыянальных літаратур, гісторыя рэгіянальных літаратур, гісторыя сусветнай літаратуры. *Тэорыя літаратуры* як своеасаблівая «матэматыка літаратуры» і яе раздзелы: эстэтыка літаратуры, паэтыка, тэорыя літаратурнага працэсу, літаратуразнаўчая метадалогія. *Літаратурная крытыка* і яе раздзелы: тэорыя крытыкі, гісторыя крытыкі. Узаемасувязь паміж галоўнымі галінамі літаратуразнаўства. Літаратурная крытыка як памежнае звяно паміж літратуразнаўствам і мастацкай літаратурай. Крытык як пісьменнік.

*Дапаможныя галіны літаратуразнаўства.*

*Палеаграфія, археаграфія, літаратурнае архівазнаўства, краязнаўства, крыніцазнаўства. Бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства. Гісторыяграфія і храналогія. Кнігазнаўства. Тэксталогія*, яе сутнасць і задачы.

### 1.2. Метадалагічныя праблемы літаратуразнаўства

Вытокі гэтых праблем у гісторыі сусветнай эстэтычнай думкі і літаратурна-мастацкай крытыкі, абумоўленасць іх разуменнем сутнасці, паходжання, гістарычнага развіцця і грамадскага значэння мастацтва слова. *Галоўныя прынцыпы аналізу мастацкіх твораў*: эстэтычны, гістарызму, сістэмнасці, цэласнасці, паяднання аналізу з сінтэзам.

Гістарычная зменлівасць літаратуразнаўчых паняццяў (тэрмін «эпіграма» ў Старажытнай Грэцыі і ў Новы час, паняцці «паэзія», «літаратура» ў XIX ст. і цяпер і г. д.), мнагазначнасць некаторых тэрмінаў («драма» як род і від літаратуры, «верш» як рытмічна арганізаваны спосаб маўлення і як вершаваны твор і г. д.). Неадэкватнасць разумення асобных тэарэтыка-літаратурных тэрмінаў рознымі даследчыкамі мастацкай літаратуры («метад», «напрамак», «від», «жанр» і г. д.).

Праблемы вывучэння гісторыі і тэорыі літаратуры ў сярэдняй і вышэйшай школе Рэспублікі Беларусь. Падрыхтоўка літаратуразнаўчых кадраў, месца іх працы.

## 2. ЭСТЭТЫКА ЛІТАРАТУРЫ

### 2.1. Агульнае і рознае ў мастацка-эстэтычным і навуковым пазнанні жыцця

*Прадмет і аб’ект* мастацкага і навуковага пазнання (мадэлявання) рэчаіснасці. Чалавек як прадмет мастацкага пазнання. Літаратура як «чалавеказнаўства» (Максім Горкі).

*Змест* пазнання ў навуцы (матэрыяльны і духоўны свет безадносна да суб’екта пазнання) і ў мастацтве (духоўны і матэрыяльны свет ва ўзаемадачыненнях з суб’ектам пазнання). Рэчаіснасць (пры ўсёй часамі «фантастычнасці» твора) у яе цэласнасці, шматбаковасці, канкрэтнасці і

агульнацікавасці як змест мастацкага пазнання. Агульнацікавасць як адна з передумоў мастацкага пазнання (у адрозненне ад навуковага).

*Сродак* пазнання: лагічны довад, сілагізм – у навуцы; вобраз – у мастацтве. Вобразная прырода мастацтва. Вобраз – уяўленне – паняцце. Адзінства ў мастацкім вобразе прадметнага і ідэальнага, канкрэтнага і ўмоўнага, індывідуальнага і абагульненага, эмацыянальна-экспрэсіўнага і рацыянальнага. Вобраз – «знаёмы незнаёмец» (В. Бялінскі). Вобраз і знак, мадэль, схема. Мастацтва як «мысленне вобразамі». Роля творчай фантазіі ў стварэнні вобраза.

*Даўгавечнасць* твораў навукі і мастацтва, Нязменнасць у часе і прасторы выдатных твораў мастацтва і зменлівасць (абмежаванасць пры выкарыстанні, удакладненне, замена іншымі, больш дасканалымі, і г. д.) твораў навукі (нават выдатных адкрыццяў, законаў і інш.).

*Мэты (функцыі)* мастацкага і навуковага пазнання. Агульнае і рознае ў асобных функцыях: пазнавальнай, эстэтычнай, геданістычнай, выхаваўчай, эўрыстычнай, прагнастычнай, этнагенетычнай (нацыятворчай, мовазахавальнай), камунікатыўнай.

## 2.2. Мастацтва і грамадскае жыццё

*Узаемаўплыў мастацтва і грамадскага жыцця.* Уплыў мастацтва на рэчаіснасць праз яго канкрэтныя функцыі (выхаваўчую, пазнавальную, этнагенетычную і інш.). Уплыў рэчаіснасці на мастацтва. *Светапогляд мастака* як асноўны «канал» гэтага ўплыву. Канкрэтна-гістарычны, сацыяльна-класавы і нацыянальны характар грамадскага і эстэтычнага ідэалаў мастака.

Маральна-этычныя, эстэтычныя, філасофскія, сацыялагічныя, рэлігійныя пошук мастака і іх выяўленне ў тэматыцы, праблематыцы, ідэйнай скіраванасці, пафасе творчасці. Тыпалогія мастацкіх ідэй паводле тэматычнага прынцыпу: сацыяльныя, палітычныя, маральна-этычныя, рэлігійныя, нацыянальна-патрыятычныя і інш. Аўтарская ідэя і аб’ектыўная ідэя твора, разыходжанне (часамі) паміж імі, прычыны гэтага разыходжання.

*Ідэйнасць і безыдэйнасць, ідэалагізацыя і дэідэалагізацыя. Тэндэнцыйнасць. Грамадзянскасць.* Крытыка «чыстага мастацтва», «мастацтва для мастацтва». *Пафас мастака* як «ідэя-страсць» (В. Бялінскі),

якой ён служыць, якая прадвызначае кірунак усіх яго ідэйна-мастацкіх пошукаў.

*Мастацкасць* як спецыфічная ўласцівасць сапраўдных твораў мастацтва і як паказчык іх дасканаласці. Прыгажосць, ісціна, дабро – тры састаўныя часткі мастацкасці. Паняцце *народнасці* творчасці пісьменніка.

## 2.3. Літаратура як від мастацтва

*Першабытнае мастацтва*, яго сінкрэтычны характар, сувязь з магіяй, рытуалам, міфалогіяй. Паступовае выдзяленне з яго іншых відаў мастацтва (музыка, харэаграфія і інш.), у тым ліку – мастацтва слова. Узнікненне вусна-паэтычнай творчасці як асобнай галіны творчай дзейнасці, суадносіны ў ёй калектыўнага і індывідуальнага пачаткаў, захоўванне дачыненняў да сінкрэтычнага старажытнага мастацтва (магія, рытуал).

*Падзел мастацтваў на асобныя віды*, крытэрыі гэтага падзелу. Мастацтвы прасторавыя (жывапіс, графіка, скульптура, архітэктура), часавыя (музыка, харэаграфія, літаратура), прасторава-часавыя (тэатр, кінамастацтва, музычныя шоў). Узнікненне новых відаў мастацтва дзякуючы развіццю тэхнікі (тэлевізійнае мастацтва), сувязі мастацтва з немастацтвам (сінхроннае плаванне, фігурнае катанне, карнавальныя шэсці і інш.).

Падзел мастацтваў на віды паводле іх галоўнага сродку вобразнага пазнання (мадэлявання) рэчаіснасці: музыка – мастацтва гуку; харэаграфія – мастацтва танца; жывапіс – мастацтва лініі і фарбы і г. д. Сінтэтычныя мастацтвы: тэатр (драматычны, опера, балет), кіна- і тэлемастацтва і інш. Літаратура як мастацтва слова.

*Мова* – не толькі сродак зносін, а «матэрыял і інструмент пісьменніка» (Я. Колас). Своеасаблівасць і перавага мастацтва слова ў параўнанні з іншымі відамі мастацтва – прасторавымі і часавымі.

*Слова і вобраз*. Вучэнне А. Патабні пра слова-вобраз, яго «знешнюю» і «ўнутраную» форму і значэнне, пра падобнасць стварэння слова і мастацкага макрасвету. Здольнасць літаратуры ствараць па-за слоўны малюнак з’яў і прадметаў, перадаваць як жывое маўленне чалавека, так і знешнія моманты яго жыцця. «Магія слова», яго рытмічнасць, музычнасць, эўфанічная выразнасць, экспрэсіўнасць. Здольнасць літаратуры перадаць унутраны свет чалавека (пачуцці, перажыванні, думкі) у іх непасрэднай канкрэтыцы і дакладнасці.

*Пісьменнік як адзін з асноўных стваральнікаў, узбагачальнікаў і захавальнікаў «душы народа» – яго мовы.* «Мукі слова». Лексікон пісьменніка, залежнасць яго ад таленавітасці творцы, сувязі яго з жывымі крыніцамі народнага маўлення, відавой і жанравай разнастайнасці творчай дзейнасці і інш.

Літаратура ў яе сувязях з іншымі відамі мастацтва (тэатр, кіно, тэлемастацтва). В. Бялінскі пра літаратуру як «*вянец мастацтваў*», паколькі яе сродак – слова – «ёсць і гук, і малюнак, і пэўнае яскрава вымаўленае ўяўленне. Таму паэзія заключае ў сабе элементы іншых мастацтваў, нібы карыстаецца раптам і непадзельна ўсімі сродкамі, якія дадзены паасобку кожнаму з іншых мастацтваў».

*Пісьменнік як творчая асоба*. Літаратурныя здольнасці, талент – асноўная перадумова творчасці. Роля суб'ектыўных і аб'ектыўных фактараў (адукацыя, працаздольнасць, засваенне вопыту знакамітых папярэднікаў і сучаснікаў і інш.) у развіцці пісьменніцкага таленту, выніках літаратурнай працы. Псіхалогія творчасці, уплыў на творчы працэс псіхафізіялагічных, сацыякультурных, грамадска-палітычных і матэрыяльных чыннікаў. Шматстайнасць форм увасаблення мастацтва слова. Асаблівасці літаратурнага таленту і асноўныя формы яго рэалізацыі: *паэзія, проза, драматургія*. Віды літаратурнай дзейнасці (у шырокім разуменні): *літаратура мастацкая, дакументальная, дыдактычная, эпісталярная, публіцыстыка, літаратурная крытыка, мастацкі пераклад*. Розныя формы слоўна-мастацкага выказвання: *празаічны і вершаваны, суб'ектыўны і аб'ектыўны, аповедны і апісальны, маналагічны і дыялагічны.*

Этапы творчага працэсу: задума твора, творчы акт, сувязь яго з натхненнем, апрацоўка твора, успрыманне яго чытачамі і крытыкамі, магчымая дапрацоўка. «Сатворчасць» чытача ў працэсе ўспрымання літаратурнага твора.

## 3. ПАЭТЫКА

### 3.1. Паэтыка як навуковая дысцыпліна

*Паэтыка* як 1) літаратуразнаўчая дысцыпліна, што вывучае структуру, характэрныя асаблівасці і змястоўнасць літаратурна-мастацкай формы; 2) абумоўленая ідэйнай задумай мастака сістэма спосабаў і сродкаў вобразнага спасціжэння свету ў іх змястоўнай, сэнсавыяўленчай сутнасці.

*Раздзелы паэтыкі*: *агульная* – разглядае ўсе спосабы і сродкі ўвасаблення аўтарскай задумы ў адпаведнасці з магчымасцямі літаратуры як мастацтва слова (літаратурныя роды, віды, жанры, мастацкая мова, строфіка і г. д.); *функцыянальная (апісальная)* – даследуе эстэтычныя кампаненты пэўнага твора, аўтара, літаратурнага напрамку ці перыяду (паэтыка А. Пушкіна, А. Міцкевіча, Я. Купалы; рамантызму, сімвалізму; старажытнарускай літаратуры; беларускага рамана XX ст. і г. д.); *гістарычная* – вывучае паходжанне і эвалюцыю мастацкіх кампанентаў твора, літаратурных відаў і жанраў (метафара, сімвал, сістэмы вершавання і г.д.) у залежнасці ад сацыяльна-гістарычных і чыста літаратурных ўмоў; *параўнальная* – займаецца тыпалагічным супастаўленнем спосабаў і сродкаў мастацка-вобразнага асэнсавання жыццёвага матэрыялу дзвюма ці больш нацыянальнымі літаратурамі (параўнальная метрыка ўсходнеславянскага верша, еўрапейскага рамана і г. д.); *практычная* – скіравана на стварэнне розных дапаможнікаў па агульнай паэтыцы дзеля выхавання паэтычнай культуры, азнаямлення чытачоў з асновамі мастацтва слова. Суадносіны тэарэтычнай і гістарычнай паэтыкі. Цесная сувязь паміж літаратуразнаўствам і лінгвістыкай пры вывучэнні паэтыкі мастацкага твора.

### 3.2. Літаратурныя роды, віды, жанры

*Эпас, лірыка, драма – роды мастацкай літаратуры і фальклору*, іх паходжанне і развіццё. Дыскусійнасць падзелу літаратуры на роды, віды і жанры, непрыняцце некаторымі даследчыкамі паняцця «віду», змяшэнне ўжывання «роду» і «жанру» і г. д. *Своеадметнасць літаратурных родаў* паводле 1) аб’екта выяўлення: падзея – у эпасе, пачуцці – у лірыцы, дзеянне – у драме; 2) вядучай формы выказвання: празаічная мова – у эпасе, вершаваная – у лірыцы, дыялагічная – у драме; 3) адносін аўтара да таго, што ім выяўляецца: эпік стаіць збоку ад тых падзей, пра якія апавядае; лірык выяўляе пачуцці праз сваё суб’ектыўнае «Я»; драматург усё перадавярае дзейным асобам, прысутнасць яго мы адчуваем толькі ў нешматлікіх рэпліках і рэмарках. Узаемасувязь паміж рознымі родамі літаратуры.

Правамернасць увядзення паняцця *віду літаратуры* як унутрыродавай і міжродавай катэгорыі, якая ўказвае на форму літаратурнага твора паводле яго некаторых структурных кампанентаў (архітэктанічных, кампазіцыйных, моўных, метрычных і інш.). Асноўныя *віды фальклорных твораў*: паэмы-эпапеі, казкі, легенды, паданні, песні, анекдоты, прыказкі і прымаўкі, загадкі. *Віды эпасу* як роду мастацкай літаратуры і іх сутнасць: раман, аповесць,

апавяданне, навела, нарыс, абразок, эсэ, гумарэска, фельетон, памфлет, мастацка-публіцыстычны артыкул. *Віды лірыкі*: песня, лірычны верш з усімі яго «цвёрдымі формамі» (санет, трыялет, актава, тэрцыны, рандо, рандэль, хоку, танка, рубаі і інш.) і разнавіднасцямі (акраверш, александрыйскі верш, элегічны двуверш, цэнтон і г.д.). *Віды драмы*: камедыя, трагедыя, уласна драма.

*Жанр літаратурны* як гістарычна акрэслены, адносна ўстойлівы тып мастацкай формы, дзе структура пэўных фармальных прыкмет (архітэктанічных, вобразных, моўных) выяўляе больш-менш канкрэтны мастацкі сэнс. Жанры старажытнай літаратуры (слова, апокрыф, жыціе, прытча і інш.), вуснай народнай творчасці (казкі – чарадзейныя, сацыяльна-бытавыя, пра жывёл і інш.; песні – каляндарна-абрадавыя, сямейна-абрадавыя, жартоўныя і інш.). *Жанры асобных відаў сучаснага эпасу і драмы*: раманы і драмы – сямейна-бытавыя, сацыяльна-бытавыя, гістарычныя, псіхалагічныя, філасофскія, прыгодніцкія, фантастычныя, сатырычныя, дэтэктыўныя, утопіі, антыўтопіі і інш. *Жанравы падзел лірыкі* на інтымную, грамадзянскую, духоўную, пейзажную, філасофскую, медытатыўную, сугестыўную. Шматстайнасць і асаблівая развітасць асобных жанравых утварэнняў у лірыцы: творы філасофска-медытатыўныя (медытацыя, элегія, пасланне, стансы, ямбы, філасофскі верш), велічальныя (ода, дыфірамб, мадрыгал, эпітафія, эпіталама), песенныя (раманс, гімн, марш, серэнада, баркарола, альба, верш-песня), сатырычна-выкрывальныя (эпіграма, пародыя, інвектыва, сатыра).

*Дыфузія родаў, відаў і жанраў.* Узнікненне міжродавых і міжвідавых утварэнняў. *Міжродавыя ўтварэнні.* Ліра-эпас і яго віды: паэма, вершаваны раман, вершаваная аповесць, вершаванае апавяданне, балада, дума, версэт, вершаказ, лірычная проза. Ліра-драма і яе віды: драматычная паэма, драматычны абразок. Ліра-драма-эпас: байка, “драма для чытання”, кіна- і тэлесцэнарый. *Міжвідавыя ўтварэнні*: трагікамедыя, меладрама, трагіфарс. *Жанравыя разнавіднасці* ў фальклоры (каляндарна-абрадавыя песні – калядкі, вяснянкі, валачобныя, купальскія, асеннія і інш.; сямейна-абрадавыя – вясельныя, радзінныя, калыханкі і інш.) і ў мастацкай літаратуры (фэнтэзі, трылер, сатырычныя оды, рамансы, замовы і інш.).

## 3.3. Літаратурны твор як мастацкае цэлае. Змест і форма

*Паняцце пра літаратурны твор* як вынік немеханічнай, адухоўленай дзейнасці аўтара. Літаратурны твор – асноўны аб’ект літаратуразнаўчага вывучэння, які валодае цэласнасцю і ўнутранай завершанасцю. Твор як самадастатковая адзінка літаратурнага развіцця, якая характарызуецца закончаным ідэйным і эстэтычным сэнсам, у адрозненне ад сваіх складнікаў – тэмы, ідэі, сюжэта, маўлення і інш., што атрымліваюць сэнс і могуць існаваць толькі ў сістэме цэлага.

*Змест і форма* як кампаненты структуры мастацкага твора. Арганічнае адзінства вобразнай формы і эмацыянальна-абагульненага зместу. Тэрміналагічнае вызначэнне *зместу* як духоўнага пачатку ў творы, «выказвання» пісьменніка пра свет, пэўнай эмацыянальнай і мысліцельнай рэакцыі на з’явы рэчаіснасці, і *формы* як матэрыяльнага пачатку твора, той сістэмы сродкаў і прыёмаў, у якой дадзеная рэакцыя знаходзіць сваё выяўленне.

3.4. Змест твора і яго кампаненты

Разуменне *тэмы* як аб’екта мастацкага ўзнаўлення, жыццёвых характараў і сітуацый, якія быццам бы пераходзяць з рэчаіснасці ў мастацкі твор і ўтвараюць аб’ектыўны бок яго зместу. Тэматыка як пераходнае звяно паміж светам рэальным і светам мастацкім. Асаблівасці змястоўнага аналізу твора: 1) разгляд аўтарскага асэнсавання ўзноўленага, 2) адродненне аб’екта ўзнаўлення (тэмы) і аб’екта адлюстравання (канкрэтнай адлюстраванай сітуацыі), 3) размежаванне тэм канкрэтна-гістарычных і вечных.

*Праблема* як сфера разуменння, асэнсавання пісьменнікам узноўленай рэчаіснасці і суб’ектыўны бок твора, як праяўленне аўтарскай канцэпцыі свету і чалавека, у якой занатоўваюцца роздумы і перажыванні пісьменніка, а тэма разглядаецца пад пэўным вуглом бачання. Разуменне цэнтральнай праблемы як арганізуючага пачатку, які пранізвае ўсе элементы зместу твора.

*Ідэя* – галоўная абагульняючая эмацыянальна-вобразная думка твора, вобласць мастацкіх рашэнняў, сфера, у якой становяцца зразумелымі аўтарскія адносіны да свету, аўтарская пазіцыя, сцвярджаецца ці адмаўляецца аўтарам пэўная сістэма каштоўнасцей. Каштоўнасны аспект і эмацыянальная накіраванасць ідэі, абумоўленая светапогляднымі, маральнымі і эстэтычнымі адносінамі аўтара да адлюстроўваемых супрацьлегласцей чалавечага жыцця.

Разуменне *пафасу* як вядучага эмацыянальнага тону твора. Тэрміналагічная сінанімія: «эмацыянальна-каштоўнасная арыентацыя»

(Г. Паспелаў), аўтарская эмацыянальнасць (В. Халізеў), «згустак, ядро пэўнага светасузірання» (А. Андрэеў) Сутнасныя характарыстыкі тыпалагічных разнавіднасцей пафасу – *драматычнага, трагічнага, рамантычнага, гераічнага, сентыменталісцкага, сатырычнага, гумарыстычнага, іранічнага*. Падабенства і адрозненне пафасаў драматызму – трагізму, героікі – рамантыкі, сатыры – гумару – іроніі.

3.5. Вобразны свет твора

*Віды вобразаў* у літаратурным творы:

1) *вобраз-рэч* – тыя рэчы, якія выконваюць у творы пэўную мастацкую функцыю: сюжэтную, псіхалагічную, сімвалічную;

2) *вобраз-пейзаж*;
3) *вобразы жывёл і птушак*;
4) *вобраз чалавека*. Тэрміналагічная сінанімія ў залежнасці ад рода літаратуры: *герой, вобраз-персанаж, дзейная асоба* – у драматычным родзе літаратуры; у эпічным родзе літаратуры разам з названымі вобразамі прысутнічаюць *апавядач* (у вялікіх па аб'ёме творах), *апавядальнік/расказчык* (у малых і сярэдніх па аб'ёме творах); толькі *лірычны герой* – у лірычным родзе літаратуры (у аповеднай лірыцы магчыма прысутнасць дзейных асоб); *герой, вобраз-персанаж, дзейная асоба, лірычны герой*, аб'яднаны з апаведачом у адной асобе – вобразы чалавека ў ліра-эпасе. *Разнавіднасці вобразаў-персанажаў*: рэальныя асобы (гістарычныя, аўтабіяграфічныя, выдумленыя, але якія маюць прататыпаў, гратэскныя, фантастычныя, рэчы-персанажы, з'явы прыроды, абстрактныя паняцці;

4) *вечныя вобразы*, якія пераходзяць з эпохі ў эпоху;

5) *вобраз краіны і народа*.

3.6. Спосабы характарыстыкі і сродкі стварэння тыповага вобраза-персанажа

*Спосабы характарыстыкі* таго ці іншага персанажа: а) аповед ад першай асобы, калі герой расказвае пра сябе сам, самараскрываецца, і ад трэцяй асобы; б) дзённік героя: шчырае, адкрытае выказванне пра ўнутраныя перажыванні і падзеі жыцця героя (распрацаваны ў сентыменталістаў; в) перапіска герояў або пасланні; г) расказ ад імя староннягa героя.

*Сродкі стварэння вобраза-персанажа:* 1) паказ дзеянняў, учынкаў персанажа; 2) мова персанажа; 3) партрэт; 4) прамая аўтарская характарыстыка; 5) характарыстыка вуснамі іншых дзейных асоб;

6) рэчыўны свет, паказ абстаноўкі, якая акружае персанажа; 7) пейзаж; 8) псіхалагічная характарыстыка; 9) вымоўнае прозвішча (гаваркое імя).

Крытэрыі класіфікацыі сістэмы персанажаў. Персанажы галоўныя, другасныя і эпізадычныя, функцыі другасных і эпізадычных персанажаў.

## 3.7. Форма мастацкага твора і яе кампаненты

3.7.1. Паняцце пра *ўзноўлены свет* твора як змадэляваную аўтарам рэчаіснасць. Кампаненты ўзноўленага свету: мастацкія дэталі, хранатоп. Мастацкія дэталі знешнія (партрэт, пейзаж, свет рэчаў) і ўнутраныя (псіхалагічныя), іх функцыі. Віды партрэту: партрэт-апісанне, партрэт-параўнанне, партрэт-уражанне, псіхалагічны. Паняцце пра *псіхалагізм* як непасрэднае глыбокае ўзнаўленне ўнутранага свету героя, яго думак, перажыванняў, жаданняў, пачуццяў. Яго прынцыповае адрозненне ад *формаў псіхалагічнага адлюстравання* ў творы: ускоснай (фіксацыя знешніх праяў псіхікі праз выраз твару, целарухі і г. д.) і сумарна-вызначальнай (лаканічнае называнне працэсаў, што адбываюцца ва ўнутраным свеце). Прыёмы псіхалагізму, іх сутнасныя характарыстыкі: аповед ад першай і ад трэцяй асобы, псіхалагічны аналіз і самааналіз, унутраны маналог, умаўчанне.

*Мастацкі час і мастацкая прастора* ў творы (паняцце пра *хранатоп*). Уласцівасці літаратурных хранатопаў у адрозненне ад іншых відаў мастацтва: здольнасць адлюстроўваць дзеянне адначасова ў розных месцах, свабодны пераход з адной часавай плыні ў другую, дыскрэтнасць (перарыўнасць) як сродак дынамізацыі сюжэта твора, умоўнасць як рыса, цесна звязаная з родавай прыналежнасцю твора (максімальная ўмоўнасць хранатопа назіраецца ў лірыцы, мінімальная – у эпасе, прамежкавая – у драме).

3.7.2. *Мова* мастацкага твора. Маўленчая арганізацыя твора і маўленчая характарыстыка персанажаў. Мова як важнейшы сродак стварэння вобраза-персанажа. Агульныя ўласцівасці мастацкай мовы: празаічнасць – вершаванасць, маналагізм – разнагалоссе, намінатыўнасць – рытарычнасць.

*Стылістычныя зрэзы твора*: лексіка ўзвышаная, зніжаная, нейтральная. Сродкі ўзбагачэння мовы твора: 1) сістэма прамых значэнняў слоў (сінонімы, антонімы, амонімы, паронімы, іх функцыі); 2) словы рознага моўнага асяроддзя (гістарызмы, архаізмы, неалагізмы/аказіяналізмы; жарганізмы, прафесіяналізмы, варварызмы, дыялектызмы), іх функцыі; 3) тропы (агульнамоўныя і аўтарскія), іх функцыі. Эпітэт, яго віды (характарызуючы, пастаянны, метафарычны);

метафара і яе віды (увасабленне, персаніфікацыя, метанімія, сінекдаха, перыфраза, гіпербала, літота); алегорыя, гратэск; сімвал, аксюмарон і інш.

*Сінтаксіс і інтанацыя* як важнейшыя маўленчыя сродкі мастацкай літаратуры. Прыёмы паэтычнага сінтаксісу: паўторы (анафара, эпіфара, кальцо, падваенне, шматзлучнікавасць, шматпрыназоўнікавасць), парушэнні звычайнай і лагічнай сувязі паміж словамі (інверсія, анакалуф, эліпсіс, амфібалія, недасказ), супастаўленне і супрацьпастаўленне радкоў (паралелізм, перанос, антытэза, ампліфікацыя), рытарычныя фігуры (рытарычнае пытанне, рытарычны зваротак, рытарычны воклiч).

*Гукапіс (фоніка).* Асноўныя прыёмы гукапісу, іх мастацкая функцыя: алітэрацыя, асананс, гукаперайманне.

3.7.3. Паняцце пра <u>*кампазіцыю*</u> ў шырокім (як структуру мастацкай формы) і ў вузкім (склад і размяшчэнне частак, элементаў і вобразаў твора ў некаторай часавай паслядоўнасці) значэннях. Кампазіцыя ўнутраная (уласна кампазіцыя) і знешняя (архітэктоніка), іх структурныя адзінкі. Прызначэнне архітэктанічнай кампазіцыі. Эпіграф, пралог, прадмова, эпілог, назва твора. Унутраная кампазіцыя. *Сюжэт і фабула*: сутнаснае размежаванне паняццяў.

*Канфлікт* як па-мастацку значная супярэчнасць, рухавік сюжэта. Суадносіны ў творы сюжэта, фабулы, канфлікту. Тэрміналагічная сінанімія: *кампазіцыя сюжэту, кампаненты сюжэта*. Экспазіцыя, завязка, развіццё дзеяння, кульмінацыя, развязка. Пазасюжэтныя элементы твора, іх функцыі ў творы: 1) апісанні партрэтныя, пейзажныя, рэчыўныя; 2) аўтарскія адступленні (лірычнага, філасофскага, аўтабіяграфічнага характару); 3) устаўныя эпізоды (адносна закончаныя фрагменты тэксту). *Тыпы сюжэтаў*: канцэнтрычны, хранікальны, шматлінейны (па Г. Паспелаву); дынамічны, адынамічны (па А. Есіну).

*Кампазіцыйныя прыёмы*: паўтор на мікра- і макраўзроўнях (кальцавая кампазіцыя), узмацненне (градацыя, ампліфікацыя), супрацьпастаўленне (антытэза, кантраст), кантамінацыя (люстраная кампазіцыя), мантаж, рэтраспекцыя і інш. Просты (адна сюжэтная лінія) і складаны (некалькі сюжэтных ліній) тыпы кампазіцыі твора.

### <u>3.8. Асновы вершазнаўства</u>

*Проза, верш, паэзія.* Адрозненне паэзіі ад проста верша. Верш – знешняе ўвасабленне, своеасаблівая “мова” паэзіі як мастацтва слова.

*Вершаваны рытм.* Разуменне вершаванага рытму як раўнамернага чаргавання аднародных моўных з’яў. Функцыі рытму: генетычная, эмоцыестваральная, сэнсавыяўленчая, мнеманічная. Рытм і *метр*. Рытм і *вершаваны памер*.

*Сістэмы вершавання*, залежнасць іх ад прасадычных уласцівасцей мовы, літаратурных традыцый. *Метрычная (антычная) сістэма*, яе сутнасць, асноўныя памеры (гекзаметр, пентаметр), уплыў на пазнейшы еўрапейскі верш і вершазнаўства.

*Танічная сістэма вершавання.* Народны танічны верш, яго рытм, сувязь з мелодыяй, напевам. Узнікненне і бытаванне літаратурнага танічнага верша ў славянскай паэзіі. Віды танічнага верша: акцэнтна-складовы, (у тым ліку кальцоўскага тыпу і каламыйкавы), дольнік, тактавік, акцэнтны (чыста танічны). Верш Маякоўскага. Месца літаратурнага танічнага верша ў сучаснай паэзіі.

*Сілабічнае вершаванне.* Яго сутнасць, гісторыя бытавання ў еўрапейскай і ўсходнеславаянскай паэзіі. Асноўныя рытмастваральныя кампаненты (жаночыя клаўзулы, рыфма, цэзура) і памеры. Рэформа Традзьякоўскага-Ламаносава.

*Сілаба-танічнае вершаванне.* Азначэнне сілаба-танічнага верша, яго асноўныя і неасноўныя (дапаможныя) рытмастваральныя кампаненты. Станаўленне сілаба-тонікі ў рускай і беларускай паэзіі.

*Свабодны верш (верлібр).* Азначэнне верлібра, яго рытмастваральныя кампаненты. Узнікненне і бытаванне свабоднага верша ў сусветнай, рускай і беларускай паэзіі. Перспектывы верлібра.

*Рыфміка.* Вызначэнне *рыфмы*, яе месца ў вершаванні. Віды рыфмы: па месцы націску (мужчынскія, жаночыя, дактылічныя, гіпердактылічныя), па ступені сугучнасці (дакладныя, багатыя, каранёвыя, анаграмныя і інш.), па іх навізне (багатыя, бедныя, аднародныя, экзатычныя і інш.). *Рыфмоўка.* Віды рыфмоўкі: паводле спалучэння рыфмамі вершаваных радкоў (сумежная, перакрыжаваная, апаясная), па колькасці рыфмаў (парная, трайная, чацвярная, манарыфма), па месцы размяшчэння рыфмаў (пачатковая, канцавая, унутраная, ланцужковая, ламаная, пантарыфма).

*Строфіка.* Азначэнне страфы, чыннікі, якія вызначаюць яе сутнасць: рыфмоўка або клаўзацыя, рытмічная аднатыпнасць вершаваных радкоў, іх інтанацыйна-сінтаксічная завершанасць. *Простыя строфы.* Друхрадкоўі. Трохрадкоўі. Чатырохрадкоўі. Пяцірадкоўі .

*Класічныя віды строфаў.* Віды складаных строфаў (ад шасці да шаснаццаці радкоў). Страфічныя комплексы: вянок санетаў, вянок вянкоў санетаў.

### 3.9. Стыль мастацкага твора

Паняцце пра *стыль* як эстэтычнае адзінства ўсіх элементаў формы твора, што мае на ўвазе падпарадкаванне ўсіх элементаў формы адзінай мастацкай заканамернасці, наяўнасці арганізуючага прынцыпу стылю, які можна знайсці ў любым фрагменце твора. Стылёвыя дамінанты як

ілюстрацыя цэласнасці стылю: у галіне адлюстраванага свету – сюжэтнасць, апісальнасць, псіхалагізм, у мастацкім маўленні – маналагізм ці рознагалоссе, намінатыўнасць ці рытарычнасць, верш ці проза, у галіне кампазіцыі – просты і складаны тыпы. Ідэнтыфікацыя аўтарскага стылю ў любым творы і нават фрагменце як на ўзроўні першаснага ўспрымання, так і на ўзроўні аналізу. Стыль як выражэнне аўтарскай арыгінальнасці. Стадыі работы над стылем: 1) усведамленне першаснага ідэйна-эстэтычнага ўражання ад стылю, той агульнай эстэтычнай танальнасці, якая увасабляе ў сабе танальнасць эмацыянальную – пафас; 2) вызначэнне заканамернасцей і дамінантаў стылю; 3) супастаўленне стылю дадзенага твора і аўтара з стылямі іншых твораў ці аўтараў.

## 4. ТЭОРЫЯ ЛІТАРАТУРНАГА ПРАЦЭСУ

### 4.1. Разуменне літаратурнага працэсу

Літаратурны працэс як гістарычнае развіццё і функцыянаванне сусветнай літаратуры, нацыянальных літаратур, узаемасувязі, узаемаўплывы, пераемнасць традыцый. Уплыў на літаратурны працэс гістарычных падзей, сацыяльна-эканамічных змен у грамадстве.

Узаемадзеянне мастацкай літаратуры з іншымі відамі мастацтва, з фальклорам, этнаграфіяй, рэлігіяй, эстэтыкай і філасофіяй. Азначэнне *метаду* ў літаратуразнаўстве як сістэмы гістарычна абумоўленых творчых прынцыпаў, якімі кіруюцца пісьменнікі, блізкія па сваёй ідэйна-творчай пазіцыі, пад час працы над сваімі творамі, як сукупнасць прынцыпаў адлюстравання рэчаіснасці ў святле пэўнага эстэтычнага ідэалу. Абумоўленасць творчага метаду часам, светаўспрыманнем, талентам пісьменніка.

Літаратурны *напрамак* як арганізацыйна-творчае адзінства ідэйных рыс у творчасці груп пісьменнікаў у той ці іншы гістарычны перыяд, абумоўленае блізкасцю светаўспрымання, стылю, памкненняў.

Літаратурная *школа* (*плынь*) як самастойнае арганізацыйна-аформленае ўтварэнне, якое мае сваю тэарэтычную платформу, маніфест, праграму, творчыя прынцыпы. Літаратурныя школы: пралеткультаўцы, рапаўцы, аберыуты, Серапіёнавы браты, кубафутурысты, лефаўцы – у Расіі, маладнякоўцы і ўзвышэнцы, бумбамлітаўцы – у Беларусі.

*Стыль* пісьменніка – сістэма вобразаў, эмоцый, паняццяў і думак, выяўленых адметнымі мастацкімі сродкамі. Індывідуальны стыль і творчая манера.

Літаратурны працэс як змена метадаў і напрамкаў, дыялектычнае адзінства традыцый і наватарства ў творчасці.

Літаратурныя метады ў еўрапейскіх краінах у XVII-XVIII–пачатку XIX стст.: *класіцызм, сентыменталізм, рамантызам. Рамантызм* як метад і яго напрамкі (класічны, неарамантызм).

*Рэалізм* як метад, што сцвярджае гуманістычныя ідэалы, праўдзівае адлюстраванне рэчаіснасці літаратурай, яе сацыяльную скіраванасць. Пашырэнне цікавасці да ўнутранага свету чалавека, псіхалагізму ў літаратары рэалізму. *Натуралізм. Касічны (крытычны) рэалізм* XIX–XX стст. Крытычны рэалізм літаратуры XIX–XX стст. мадэрнісцкія напрамкі ў рэалізме рачатку XX ст.: дэкаданс, сімвалізм, футурызм, імажынінізм, акмеізм.

*Сацыялістычны рэалізм* як літаратурны напрамак, выкліканы спецыфічнымі сацыяльнымі ўмовамі. Асноўная задача сацыялістычнага рэалізму – выхаванне чытача ў духу камуністычных ідэй.

*Мадэрнізм* як літаратурны метад і як сацыяльная з’ява. Напрамкі мадэрнізму: *сімвалізм, футурызм, імажынізм, акмеізм, імпрэсіянізм, экспрэсіянізм. Постмадэрнізм.*

Паняцце пра літаратурны авангардызм і дэкаданс.

Традыцыі і наватарства ў літаратуры, іх дыялектычная сувязь. Наследаванне, перапеў, стылізацыя, запазычанне, эпігонства як праявы традыцыйнасці і наватарства ў літаратуры.

## 4.2. Літаратурныя сувязі, іх віды

Літаратурныя сувязі як форма творчых кантактаў паміж літаратурамі розных народаў, іх стваральнікамі і чытачамі. Віды сувязей: тыпалагічныя, генетычныя, кантактныя.

*Тыпалагічныя сувязі* як найбольш агульныя разнавіднасці сувязей. Тыпалогія літаратур як аб’ект вывучэння ў літаратуразнаўстве.

*Генетычныя сувязі* – запазычанні, наследаванні, уплывы. Узбагачэнне іншакраіннымі літаратурамі новых у сферах сюжэтабудавання, вобразнай тканіны. Матываў і жанравых разнавіднасцей твораў, стыляў і метадаў.

*Кантактныя сувязі* – найбольш дзейсны сродак узаемадзеяння літаратур.

Віды пісьменніцкіх сувязей: асабістае сяброўства, ліставанне, з’езды, канферэнцыі, творчыя камандзіроўкі, замежныя паездкі, падарожжы. Міграцыя, дысідэнцтва, праследаванні пісьменнікаў, міжнародныя ваенныя канфлікты, іх уплыў на ўзаемныя кантакты літаратур.

Сувязі пісьменнік–чытач. Спецыфіка ўздзеяння на чытача літаратуры сучаснасці і мінулага. Сувязь паміж чытацкімі пакаленнямі. Працэс успрыняцця літаратуры і ўплыў на чытача літаратурнай крытыкі.

### 4.3. Мастацкі пераклад

Мастацкі пераклад як адзін з важнейшых сродкаў літаратурных узаемасувязей. Культурныя і моўныя перашкоды ва ўзаемных кантактах літаратур. Мастацкі пераклад і літаратурны працэс.

Мастацкі пераклад – спецыфічны род мастацкай творчсці ў сферы літаратуры. Адрозненне яго ад сінхроннага, камунікатыўнага, машыннага перакладу.

Праблемы адэкватнасці і эквівалентнаці ў мастацкім перакладзе. Моўныя і літаратурныя пытанні ў тэорыі і практыцы мастацкага перакладу. Гістарычныя разнавіднасці мастацкага перакладу ў працэсе яго развіцця: вольны пераклад, літаралісцкі пераклад, рэалістычны пераклад. Залежнасць перакладу ад тыпу тэкста, роду, жанра.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

### I. Даведачная літаратура

1. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рдэкал. Г. П. Пашкоў (гал. Рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1996-2004.

2. Литературный энциклопедический словарь / под общ. ред. В. М. Кожевникова и П. А. Николаева. М., 1987.

3. Литературная энциклопедия терминов и понятий / гл. ред. и составитель А. Н. Николюкин. М., 2001.

4. *Рагойша, В. П.* Паэтычны слоўнік. 3-е выд. / В. П. Рагойша. Мінск, 2004.

5. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5-і т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 1985–1987.

**II. Вучэбныя дапаможнікі**

1. *Абрамович Г.* Введение в литературоведение / Г. Абрамович. М., 1975.

2. Введение в литературоведение / под ред. Г. Н. Поспелова. М., 1988.

3. Введение в литературоведение: Литературное произведение: основные понятия и термины / Л. В. Чернец [и др.]. М., 1999.

4. Введение в литературоведение: учебник / под ред. Л. М. Купчанова. М., 2005.

5. *Есин, А. Б.* Принципы и приемы анализа литературного произведения / А. Б. Есин. М., 2001.

6. Основы литературоведения / под ред. В. П. Мещерякова. М., 2000.

7. *Рагойша, В. П.* Беларускае вершаванне: вуч. дапам. / В. П. Рагойша. Мінск, 2011. (Класічнае ўніверсітэцкае выданне).

8. *Рагойша, В. П.* Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В.П. Рагойша. – Мінск, 2001.

9. *Тимофеев, Л.* Основы теории литературы / Л. Тимофеев. М., 1976.

*Ткаченко, А.* Мистецтво слова: вступ до літературознавства / А. Ткаченко. Київ, 1998.

10. Уводзіны ў літаратуразнаўства: хрэстаматыя / аўт.-уклад. М. І. Мішчанчук, М. Ф. Шаўлоўская. 3-е выд. Мінск, 2004.

11. Уводзіны ў літаратуразнаўства: у 2 ч. / пад рэд. в. П. Рагойшы. – Мінск, 2010-2011.

12. *Федотов, О. М.* Основы теории литературы. Ч. 1, 2. / О. М. Федотов. М., 2003.

**III. Дапаможная літаратура.**

1. *Андреев, А. Н.* Целостный анализ литературного произведения / А. Н. Андреев. Минск, 1995.

2. *Гиршман, М. М.* Стиль литературного произведения / М. М. Гиршман. Донецк, 1984.

*Грехнев, В. А.* Словесный образ и литературное произведение / В. А. Грехнев. Н. Новгород, 1997.

3. *Лотман, Ю. М.* Анализ поэтического текста. Структура стиха / Ю. М. Лотман. М., 1972.

4. *Лебединский, С. И.* Теория и практика перевода / С. И. Лебединский. М., 2001.

5. *Маслова, В. А.* Филологический анализ художественного текста / В. А. Маслова. Минск, 2000.

6. *Пяткевіч, А.* Сюжэт. Кампазіцыя. Характар / А. Пяткевіч. Мінск, 1981.

7. *Ралько, І. Д.* Беларускі верш: пытанні гісторыі і тэорыі / І. Д. Ралько. Мінск, 1969.

8. *Томашевский, Б. В.* Теория литературы. Поэтика / Б. В. Томашевский. М., 1996.

9. *Хализев, В. Е.* Теория литературы / В. Е. Хализев. М., 1999.

10. *Элсанек, А. Я.* Основы литературоведения: анализ художественного произведения / А. Я. Элсанек. М., 2001.